У паход за ўсебеларускі сталінскі заклік калгасьнікаў у сацыялістычную прамысловасьць

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выданьня—XV
№ 205 (4110)
ПЯТНІЦА, 31 ліпеня 1931 г.
Выходзіць БЕСЬПЕРАПЫННА.

Пачынаньне кантэміраўцаў і армавіраўцаў павінна стаць здабыткам кожнага калгасу, прадпрыемства, прафсаюзу

УВЕСЬ ДРУК БССР АБАВЯЗАН СТАЦЬ НА ЧАЛЕ СТАЛІНСКАГА ЗАКЛІКУ КАЛГАСЬНІКАЎ НА ФАБРЫКІ, ЗАВОДЫ І САУГАС

„Нельга больш разьлічваць на самацёк рабочай сілы. Значыць, ад „палітыкі" самацёку трэба перайсьці да палітыкі арганізаванага набору рабочых для прамысловасьці" (І. СТАЛІН)

Кампаніі уборкі тэхкультур—бальшавіцкае кіраўніцтва

БССР — адзін з **АПОРНЫХ ПУНКТАЎ ІЛЬНАВОДЗТВА** Савецкага Саюзу. Бальшавіцкія тэмпы індустрыялізацыі і гістарычныя перамогі саўгаснага будаўніцтва і калгаснага руху абумовілі буйнейшыя посьпехі спэцыялізацыі сельскай гаспадаркі.

У бягучым годзе плошча пад тэхнічнымі культурамі значна **ПАВЯЛІЧЫЛАСЯ**, гэта значыць **ПАШЫРЫЛАСЯ** сырцовая база лёгкай індустрыі.

Пытаньне-ж аб разьвіцьці лёгкай індустрыі пасьля XVI зьезду УсеКП(б) стаіць **ПА-НОВАМУ.** Побач з далейшым фарсаваным разьвіцьцём цяжкай індустрыі — гэтай «адзінай базы сацыялізму» (Ленін), партыя паставіла задачу больш шпаркімі тэмпамі разьвіваць і лёгкую прамысловасьць, што спрыяе далейшаму паляпшэньню культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых мас. Вось чаму праблема тэхнічных культур, праблема сырцовай базы для лёгкай індустрыі — ільнаводзтва ва ўмовах БССР мае важнае значэньне.

КП(б)Б пад кіраўніцтвам Цэнтральнага Камітэту ў непрымірымай барацьбе на два фронты дасягнула гігантскіх посьпехаў у вырашэньні праблемы тэхнічных культур. У часе веснавой сяўбы плошча пад тэхнічнымі культурамі была значна **ПАШЫРАНА.** Плян сяўбы ільну выкананы на **101 ПРОЦ.** Параўнальна з мінулым годам пасеўная плошча пад ільном вырасла **на 61,3 ПРОЦ.** пры агульным павялічэньні пасеваў ільну па СССР на **35,1 ПРОЦ.**

Гэта сур'ёзная перамога, але перамога неканчатковая. Мала засеяць лён, трэба забясьпечыць яшчэ **СВАЯЧАСОВУЮ І ПАСЬПЯХОВУЮ ЎБОРКУ І АПРАЦОЎКУ ТЭХКУЛЬТУР.** Перад вясковымі партыйнымі арганізацыямі ва ўсёй вышыні паўстае адказьнейшая гаспадарча-палітычная задача— **забясьпечыць перамогу і на фронце ўборачнай кампаніі і апрацоўкі ільну і канапель.**

Між тым мы маем шматлікія факты, калі райкомы партыі і партыйныя ячэйкі **НЕ АДДАВАЛІ** належнай увагі як поліву ільну, так і падрыхтоўцы да ўборачнай кампаніі. У выніку ў цэлым радзе месц поліва ільну недапушчальна зацягнулася і нават ня скончана і да гэтага часу. Частка райкомаў ільнаводчых раёнаў праявіла недапушчальную недаацэнку праполачнай кампаніі, не мабілізаваўшы вакол яе калгасных і аднаасобных бядняцка-серадняцкіх мас. Гэты недахоп у тых мясцох, дзе сяўба ільну праведзена са спазьненьнем, яшчэ можна і неабходна **ВЫПРАВІЦЬ.**

Тэхнічная база ільнаводзтва БССР пяўхільна **РАСЬЦЕ І ЎЗМАЦНЯЕЦЦА.** У бягучым годзе ў БССР завозіцца значная колькасьць машын для ўборкі і апрацоўкі ільну і канапель. Уступаюць у строй **30 новых машынна-трактарных станцый.** Аднак, трэба ўлічваць, што ўборачная кампанія ў гэтым годзе будзе праводзіцца ў асноўным яшчэ **РУЧНЫМ СПОСАБАМ.** Таму партыйныя арганізацыі павінны ва што-б там ні стала забясьпечыць **ВЫРАЗНУЮ І ПРАВІЛЬНУЮ РАССТАНОЎКУ СІЛ НА ЎБОРАЧНЫХ РАБОТАХ.** Правільная арганізацыя працы на аснове зьдзельшчыны, ацэненай у працаднёх, вырашае посьпех уборкі.

Кожная ячэйка павінна зараз-жа дакладна распрацаваць пытаньне аб ўборцы ільну і канапель, вызначыўшы канкрэтныя мерапрыемствы, якія забясьпечваюць **УЗДЫМ** прадукцыйнасьці працы, сваячасовую ўборку і баявую падрыхтоўку да апрацоўкі тэхкультур.

Трэба да канца **ЛІКВІДАВАЦЬ АБЯЗЬЛІЧКУ** і забясьпечыць **НЕАДКЛАДНАЕ ЎКАРАНЕНЬНЕ САПРАЎДНАЙ ЗЬДЗЕЛЬШЧЫНЫ З УЛІКАМ У ПРАЦАДНЁХ ВА ЎСЕ КАЛГАСЫ.** МТС і саўгасы абавязаны перайсьці на зьдзельшчыну, ліквідаваўшы ўраўнілаўку і абязьлічку.

Уся масавая работа па забясьпячэньні ўборачнай кампаніі і першапачатковай апрацоўкі ільну як у сацыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі, так і ў аднаасобным павінна ісьці побач з мабілізацыяй калгасных і бядняцка-сераднякіх аднаасобных мас на **сваячасовае і поўнае выкананьне плянаў кантрактацыі.** Райкомы і сельпарткомы павінны зараз-жа правесьць падрыхтоўку нізавых зьвеньняў партарганізацый да ільнаўборачнай кампаніі і забясьпечыць бальшавіцкае выкананьне гэтай важнейшай задачы.

У сувязі са значным пашырэньнем плошчы пад ільном і спэцыялізацыяй у напрамку ільнаводзтва многіх раёнаў БССР,—ва ўсю шырыню паўстае задача **МЭХАНІЗАЦЫІ** ільнаапрацоўкі. Апрацоўка ільну ручным спосабам ня можа даць належнай эфэктнасьці, і апрацоўка ільну пры такіх умовах падаражала-б сабекошт прадукцыі, што ў канчатковым выніку магло-б адбіцца на далейшым пашырэньні ільнаводзтва. Таму **ПАРТЫЯ РАШУЧА ПАСТАВІЛА ПЫТАНЬНЕ АБ МЭХАНІЗАЦЫІ ІЛЬНА-АПРАЦОЎКІ.**

Аднак, будаўніцтва пунктаў першапачатковай апрацоўкі ільну, забясьпячэньне гэтых пунктаў адпаведным абсталяваньнем праходзіць недапушчальна **МАРУДНА.**

Невыстарчальныя тэмпы будаўніцтва новых заводаў тлумачацца ў значнай меры тым, што многія **мясцовыя партаарганізацыі зусім слаба цікавяцца гэтай справай.** Такія пытаньні, як спыненьне цякучасьці рабочай сілы па будаўніцтве, разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва, барацьба з ураўнілаўкай і абязьлічкай, мабілізацыя ўнутраных рэсурсаў (мясцовыя будаўнічыя матар'ялы—лес, цэгла і інш.), павінны стаяць у цэнтры ўвагі райкомаў і будаўнічых парт'ячэек. **УЗНАЧАЛІЦЬ** актыўнасьць рабочых будаўнікоў—важнейшая задача мясцовых партарганізацый і неабходная ўмова ў справе забясьпячэньня пабудовы ў гэтым годзе 46 новых ільнаапрацоўчых заводаў **ВА ЎСТАНОЎЛЕНЫ ТЭРМІН.**

Заклік рабочых **мсьціслаўскага** ільнаводу і ініцыятыву рабочых **копыськага** заводу, якія высунулі сустрэчны плян **скарачэньня тэрмінаў работы** і, замацаваўшы сябе да канца будаўніцтва, уступілі ў штурм прарываў,—трэба шырока папулярызаваць і **зрабіць здабыткам кожнай будоўлі ільназаводаў.** Органы КК-РСІ павінны ўзяць пад **асаблівы нагляд** ход будаўніцтва ільназаводаў і сваёй работай **папярэджваць** узьнікненьне прарываў. Вясковыя партарганізацыі павінны павярнуцца тварам да будаўніцтва і забясьпечыць перамогу на гэтым баявым вучастку, рашуча выкарыстоўваючы праваапартуністычную практыку.

Уборка і першапачатковая апрацоўка ільну—задача надзвычай важная і адказная. Выкананьне гэтай задачы патрабуе максымальнай увагі і напружанай работы партарганізацыі.

Вялізарная адказнасьць у справе барацьбы за тэхкультуры ляжыць на партыйна-савецкімі друку. Цэнтральныя і раённыя газэты, а таксама шматтыражкі і насьцентгазэты, абавязаны разгарнуць шырокую апэрацыйна-масавую работ вакол пытаньняў уборкі і рэалізацыі ўраджаю ільну і канапель.

На жаль, з боку раду газэт мы маем яўную недаацэнку праблемы тэхкультур, слабую барацьбу за сапраўды баявыя тэмпы падрыхтоўкі да ўборкі.

УСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА РЭДАКТАРОЎ ГАЗЭТ ІЛЬНАВОДЧЫХ РАЁНАЎ І ЦЭНТРАЛЬНАГА ДРУКУ, якая сёньняадкрываецца пры культпроце ЦК КП(б)Б, павінна паслужыць пераломны момантам у рабоце друку, павінна вызначыць канкрэтныя шляхі далейшай барацьбы газэт за лён і канаплю. Уборачная кампанія — фронт клясавай барацьбы. Руйнуючы супраціўленьне кулака і яго агентуры-апартуністаў, арганізуем новы магутны ўздым калгаснага прыліву, убярэм і апрацуем лён у тэрмін.

На рашучую барацьбу з „палітыкай" самацёку

Перадавыя калгасы Кантэміраўскага раёну (цэнтральная чорназёмная вобласьць) абвясьцілі сталінскі заклік калгасьнікаў у сацыялістычную прамысловасьць.

Незалежна ад кантэміраўцаў, арцель імя Будзённага (Армавірскі раён, Паўночна-Каўказскага краю) выступіла на старонках газэты «Социалистическое земледелие» з прапановай да ўсіх калгасьнікаў СССР арганізаваць у кожным калгасе сталінскія кадры адыходнікаў.

Так адгукнуліся перадавыя калгасы і калгасьнікі на заклік партыі аб арганізаваным наборы рабочай сілы для прамысловасьці. Задачы, высунутыя тав. Сталіным у яго эпошняй прамове аб новай абстаноўцы і новых задачах гаспадарчага будаўніцтва захапляюць таксама і шырокія масы калгаснага сялянства.

Выступленьні гэтых калгасаў маюць вялізарнае палітычнае значэньне. Яны сьведчаць аб тым, што ў нас ёсьць усе магчымасьці, каб пакончыць з «палітыкай» самацёку і на справе перайсьці да палітыкі арганізаванага набору рабочай сілы для прамысловасьці.

«Социалистическое Земледелие» і «Труд» пачалі кампанію за арганізацыю сталінскага закліку калгасьнікаў у сацыялістычную прамысловасьць. «Зьвязда» ўключаецца ў гэту кампанію і абвяшчае паход за ўсебеларускі сталінскі заклік калгасьнікаў. «Зьвязда» прымае выклік газэты «Социалистическое Земледелие» і «Труд» і са свайго боку зварачаецца да ўсяго раённага і нізавога друку, да ўсіх рабселькораў і брыгад, падхапіць пачынаньне кантэміраўцаў і армавіраўцаў. Друк БССР павінен дабіцца, каб пачынаньне кантэміраўцаў і армавіраўцаў стала здабыткам кожнага раёну, калгасу, прадпрыемства, прафсаюзу.

Друк павінен узяць пад свой кантроль працу гаспадарчых органаў, прафсаюзаў, органаў працы, калгасна-зямельнай сыстэмы па арганізаваным наборы адыходнікаў у сацыялістычную прамысловасьць.

Раённыя і нізавыя газэты, рабселькоры і брыгады абавязаны сыстэматычна змагацца за ажыцьцяўленьне ўсіх ільгот, прадастаўленых адыходнікам пастановай ЦВК і СНК СССР ад 30-га чэрвеня, узяць пад жорсткі абстрэл усякія імкненьні праўленьняў асобных калгасаў перашкаджаць адыходу пад якімі бы там ні было прычынамі, у якой-бы там ні было форме. Асаблівы нагляд трэба ўстанавіць у сувязі з гэтым над выпучэньнем у калгасах спэцыяльнага харчовага фонду для забясьпячэньня сем'яў адыхднікаў з тым, каб гэта забясьпячэньне праходзіла ў поўнай адпаведнасьці з указаньнямі ўраду.

Павінна быць распачата сыстэматычная барацьба за хутчэйшае разгортваньне дагаворнай кампаніі, за выкананьне дагавораў паміж гаспадарчымі органамі і калгасамі.

Фабрычна-заводзкі друк, апрача ўсіх гэтых задач, павінен узяць пад асобны нагляд разгортваньне масава-палітычнай выхаваўчай работы сярод адыходнікаў на прадпрыемствах і ўсіх мерапрыемстваў, якія забясьпечваюць замацаваньне на вытворчасьці новых рабочых наогул і ў прыватнасьці, тых, якія прыбудуць з вёскі ў парадку арганізаванага набору ў лік сталінскага закліку ў сацыялістычную прамысловасьць

„Камунар" заключыў дагавары на плянавае забясьпячэньне рабочай сілай

У першым паўгодзьдзі зав. «Камунар» сыстэматычна ня выконваў свайго пляну.

Гістарычная прамова тав. Сталіна стала баявой праграмай барацьбы за кожны процант прамфінпляну.

Першыя вынікі ліквідацыі абязьлічкі

У ліквідацыі абязьлічкі ёсьць ужо пэўныя дасягненьні. У такарным і кавальскім цэху ўстаноўлены цьвёрдыя зьмены. Кажная зьмена мае пастаянны склад рабочых і тэхпэрсаналу. Кожны майстар мае пэўную колькасьць варштатаў, кожны варштат мае сваіх пастаянных 4-х рабочых. Да кожнага варштату прымацавана пэўная колькасьць апэрацый. Плянавікі абавязаны пры выпісваньні нараду на работу паказаць № варштата і на гэтым іменна варштаце павінна рабіцца паказаная ў нарадзе работа. Дзякуючы гэтаму стала магчымым складаньне месячнага пляну работы для кожнага варштату паасобна. На гэтых плянах, плянава-разьмеркавальнае бюро цэху будзе штодзенна адзначаць выкананьне пляну за кожны дзень.

У выніку поўнай ліквідацыі абязьлічкі бляшаны цэх, напрыклад, дабіўся вялікіх посьпехаў. У лінені вядзёрчыкі зьнішчылі зусім брак і высунулі сустрэчны плян: замест 20 тыс.—25 тыс. вёдзер. Ліквідацыя абязьлічкі ў бляшаным цэху павяла да зьнішчэньня сабекошту катлоў. Асобныя брыгады бляшанікаў датэрмінова перавыканалі прамфінплян. Брыгада **Мінковіча** да 26/VII замест 175 катлоў зрабіла 210, і перакінула сваіх людзей у брыгады па вырабе флянг для ліквідацыі там прарыву.

Гаспадарчы разрахунак укараняецца ў кожны цэх. Да 1-га жніўня канчаецца заключэньне дагавораў як паміж цэхамі, так і паміж цэхам і паасобным аддзелам заводакіраўніцтва. Да 1-га жніўня пераходзяць на гаспадарчы разрахунак 4 брыгады.

Брыгады, якія працуюць на масавай рабоце, пераведзены на прагрэсыўную прэміяльную сыстэму аплаты. Вядзецца работа па зьнішчэньні ўраўнілаўкі і камунах і брыгадах.

Дагавары на рабочую сілу

«Камунар» прыступіў да плянавага забясьпячэньня прадпрыемства рабочай сілай. 25-га ліпеня былі пасланы брыгады ў падшэфны Каралішчанскі сельсавет і падшэфную вайсковую часьць для заключэньня дагавораў на рабочую сілу. У Каралішчанскім сельсавеце заключаны дагавор на 15 цесьляроў, таксама на плянавае забясьпячэньне рабочай сілай.

У падшэфнай вайсковай часьці дзецца растлумачальная праца сярод чырвонаармейцаў адпускнікоў у мэтах іх вярбоўкі на завод. У гэтай галіне ёсьць ужо вынікі. 25 адпускнікоў дагоду застацца на завод. У гэтай галіне Для падрыхтоўкі кваліфікаванных кадраў і для ўзьняцьця тэхнічных ведаў пры заводзе **арганізоўваецца тэхнікум з 4-ма ступенямі.** Тэрмін навучаньня ў кожнай ступені аднагадовы. У першай ступені будуць навучаць новых рабочых, набраных з калгасаў, Чырвонай армії і чорнарабочых. Пасьля скончэньня яны пераходзяць на больш кваліфікаваную работу, атрымліваюць як мінімум, 2 разрад і пераводзяцца ў другую ступень. У другой ступені будуць навучацца ЦПР'аўцы, малакваліфікаваныя рабочыя, а ў трэцяй ступені—сярэдняя кваліфікаваныя рабочыя і прафпікоўцы з аб'ёмам ведаў за сямігодку. Тэрмін навучаньня—10 месяцаў. Пасьля скончэньня пераходзяць на курсы майстроў і тэхнікаў, а таксама могуць паступіць ва ўсе іншыя навучальныя установы. У 4-ай ступені навучаюцца брыгадзіры, майстры, плянавікі і высокакваліфікаваныя рабочыя, якім пасьля скончэньня дасцца права паступленьня на курсы тэхнікаў.

Брыгада рабкораў - ударнікаў «Зьвязды» і заводзкай шматтыражкі «Камунаравец».

11-ты ДЗЕНЬ МЕСЯЧНІКА ГЕНЭРАЛЬНАЙ ПРАВЕРКІ І САМАПРАВЕРКІ

Непрымірыма змагацца з кулацкімі прынцыпамі разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю ў калгасах

ПА-БАЯВОМУ РАЗГОРТВАЮЧЫ УБОРКУ ЗБОЖЖАВЫХ, ШТУРМАВАЦЬ ПРАРЫВЫ НА ВУЧАСТКУ КАСЬБЫ

ДА 5-га ЖНІЎНЯ СЕНАЎБОРКА ПАВІННА БЫЦЬ СКОНЧАНА

Не паўтараць памылак!

Пастанова НКЗ і Калгасцэнтру БССР

Адзначыць, што нават да апошняга часу большасьць райзаў і калгасаўзаў не разгарнулі масавай работы сярод калгасаў і калгасьнікаў па растлумачэньні пастановы НКЗ і Калгасцэнтру СССР аб прыкладным разьмеркаваньні даходаў у калгасах у 1931 г. А **Койданаўскі, Крупскі, Менскі, Чырвона - Слабодзкі, Лёзьнянскі, Слуцкі, Гарадоцкі, Бабруйскі** і рад іншых раёнаў, ня гледзячы на спэцыяльную дырэктыву Белкалгасцэнтру ад 6-VII 31 г. і рад далейшых указаньняў, праявілі апартуністычную бязьдзейнасьць і не забясьпечылі кіраўніцтва ў справе разьмеркаваньня грубых кармоў у калгасах. У выніку гэтага рад калгасаў, як зусім правільна паказваюць газэты «Правда» і «Зьвязда», дапусьцілі яўна кулацкія мэтады разьмеркаваньня ўраджаю грубых кармоў. Гэтыя скажэньні заключаюцца ў тым, што сена разьмяркоўваецца паміж калгасьнікамі для іх неаграмаджанай жывёлы да сканчэньня сенаўборкі, непасрэдна на сенажаці, бяз уліку колькасьці і якасьці працы калгасьнікаў, а па каровах, едакох і гаспадарках, бяз уліку патрэбнасьці ў кармох аграмаджанай жывёлы і здачы (продажы) дзяржаве грубых кармоў на кантрактацыі.

Такі кулацкі парадак разьмеркаваньня сена яўна супярэчыць **ПАСТАНОВЕ НКЗ І КАЛГАСЦЭНТРУ СССР,** падрываючы зьдзельшчыну, і награжае зрывам мерапрыемстваў па разьвіцьці аграмаджанай жывёлагадоўлі.

Таму Наркамзем і Калгасцэнтр БССР пастанаўляюць:

Прапанаваць усім загадчыкам райзаў, старшыням калгассаюзаў і дырэктарам МТС пад іх асабістую адказнасьць зараз-жа спыніць якое-б там ні было разьмеркаваньне грубых кармоў. Разьмеркаваньне павінна праводзіцца ў адпаведнасьці з пастановай НКЗ і Калгасцэнтру СССР, пасьля ўліку ўсяго сабранага ўраджаю, складаньня фуражных балянсаў, выкананьня кожным калгасам сваіх абавязкаў перад дзяржавай па здачы (продажы) і стварэньні фуражных фондаў для аграмаджанай жывёлы калгасу.

2. Абавязаць усе райзы, праўленьні калгассаюзаў і МТС узмацніць работу па растлумачэньні пастановы НКЗ і Калгасцэнтру СССР аб прыкладным разьмеркаваньні прыбыткаў ў калгасах, рашуча змагаючыся супроць кулацкіх тэндэнцый разьмеркаваньня прыбыткаў у калгасах па едакох, дварох і іншых кулацкіх ураўнілаўскіх прынцыпах.

3. Абавязаць усіх работнікаў НКЗ і Калгасцэнтру БССР, якія пасланы і пасылаюцца ў раёны для правядзеньня ўборачнай кампаніі, цэнтр ціжару сваёй работы пераключыць на справу разьмеркаваньня даходаў у калгасах, папярэдзіўшы іх, што за невыстарчальнае растлумачэньне калгасьнікам і калгасьніцам правільных прынцыпаў разьмеркаваньня даходаў і ўраджаю ў калгасах і за непрыняцьце мерапрыемстваў супроць скажэньняў у гэтай справе, яны будуць адказваць нароўні з загадчыкам райза старшынямі калгассаюзаў.

4. Даручыць сэктару пазеркі выкананьня НКЗВ, аргмасаваму сэктару Белкалгасцэнтру ўзмацніць жывое кіраўніцтва і кантроль у галіне разьмеркаваньня прыбыткаў у калгасах, безадкладна рэагуючы на найменшыя скажэньні пастановы НКЗ і Калгасцэнтру СССР аб прыкладным разьмеркаваньні прыбыткаў у калгасах.

Для ўзмацненьня гэтай работы і пераводу калгасаў на зьдзельшчыну не пазьней 31-VII [illegible] г., камандываць у раёны ня [illegible] 200 студэнтаў с.-г. ВНУ.

5. За грубейшае скажэньне ў справе разьмеркаваньня сена ў калгасах, загадчыку **Койданаўскага** райза тав. **Жылкоўскаму** абвясьціць суровую вымову з папярэджаньнем, а старшыню праўленьня **Койданаўскага калгассаюзу** тав. **Хадасевіча з працы зьняць.**

Загадчыкам райзаў і старшыням калгассаюзаў Крупскага, Менскага, Чырвона-Слабодзкага, Лёзьнянскага, Слуцкага, Гарадоцкага і Бабруйскага раёнаў за нядбайныя адносіны да растлумачэньня пастановы НКЗ і Калгасцэнтру СССР аб прыкладным разьмеркаваньні даходаў у калгасах і непрыняцьце рашучых мер супроць кулацкай дзяльбы сена абвясьціць вымовы.

Папярэдзіць усіх загадчыкаў райзаў, старшынь калгассаюзаў, дырэктароў МТС, а таксама ўсіх таварышоў, мабілізаваных на правядзеньне ўборачнай кампаніі, што іх работа будзе ацэньвацца тым, наколькі хутка і правільна яны растлумачаць усім калгасьнікам і калгасьніцам пастанову НКЗ і Калгасцэнтру СССР аб прыкладным разьмеркаваньні даходаў у калгасах, рашуча змагаючыся супроць кулацкай агітацыі і кулацкіх тэндэнцый у справе разьмеркаваньня даходаў у калгасах.

Нам. наркома зямляробства БССР
МАСЮКОЎ.
Нам. старшыні праўленьня
Калгасцэнтру БССР
СТРЭЛЕ.

Ігнараваньне зьдзельшчыны вядзе да кулацкай ураўнілаўкі

ЛОЕЎ. Па многіх калгасах Лоеўскага раёну зьдзельшчына не ўкаранена, не замацавана, прыкладны парадак разьмеркаваньня даходаў калгасьнікаў невядомы. Вынікі невыстарчальнага кіраўніцтва гэтымі калгасамі, галоўным чынам, з боку раённых зямельна-калгасных арганізацый, і апартуністычная недаацэнка зьдзельшчыны, якая праяўляецца з боку раду раённых і нізавых арганізацый, даюць сябе моцна адчуваць. Вось некаторыя прыклады:

Фармальны пераход па зьдзельшчыну ў калгасе «Чырвоная Зорка» прывёў да абурэчых скажэньняў. **Норма выпрацоўкі ацэньваецца не ў працаднёх, а ў грошах.**

Па частцы калгасаў наглядаецца разбазарваньне працадзён бяз уліку колькасьці і якасьці работы, зробленай калгасьнікам. Вось чаму ў калгасах «Першае мая», «Авангард» і некаторых іншых заўважаецца наступнае: Калгасьнікам мэханічна налічваецца па два працадні за адзін рабочы дзень. Падрост 12 гадоў за пасьбу коняй атрымлівае 1,25 працадня.

Фактычная адсутнасьць зьдзельшчыны і незнаёмства калгаснай масы з [illegible] станоўай аб прыкладным разьмеркаваньні даходаў, спрыяе шкодніцкай работе кулака па распаўсюджаньні тэндэнцый разьмеркаваць даходы і ўраджай па [illegible]кох. Гэта ў сваю чаргу ўжо выклікае масавы нявыхад на работу, асабліва жанчын.

Трэба зара-жа рэагаваць на ўсе гэтыя факты, моцна ўдарыўшы па мясцовых апартуністах.

А. КАРПЕНКА.

Першыя вынікі ліквідацыі абязьлічкі

Дагавары на рабочую сілу

Ударыць па апартуністах, выгнаць падкулачнікаў

РАГАЧОЎ. У вёсцы Навасёлкі, Ціхініцкага сельсавету, арганізован калгас «Чырвоны Крым» з 12 гаспадарак. Калгасьнікі абвясьцілі сябе ўдарнікамі і за 4 дні ўзьнялі 20 га папару, скаспілі і ўбралі 12 га сенажаці. Пасьпяховай працы калгасу перашкаджае кулацтва, якое разгарнула моцную агітацыю супроць калгасаў і імкнецца рознымі правакацыямі ўзарваць калгас.

Сельсавет не дае рашучага адпору кулацтву. Кулакі ня выконваюць цьвёрдых заданьняў, застаючыся беспакаранымі. На заможніка Валодкіна Парфена некалькі раз накладаўся штраф, але ён да гэтага часу яшчэ не спагнаны. Заможнікі Рынкевіч С. і Храмянкоў Васіль у 28-29 годзе фармальна падзяліліся і цяпер лічацца маломоцнымі сераднякамі гаспадаркамі Сельсавет і на гота не рэагуе.

Райкомпарт і РКК-РСІ павінны рашуча ўдарыць па апартуністах, якія засялі ў сельсавеце.

ЖУРАЎЛЕЎ Х.

204.196 га—8,8% збожжавых убрана на 25-га ліпеня

Ход уборкі збожжавых

Па вестках Наркамзему на 25-га ліпеня ход уборкі збожжавых па БССР характарызуецца наступнымі данымі: ЗЖАТА АЗІМЫХ—жыта і пшаніцы ПА САЎГАСАХ 4,1 ПРОЦ., ПА КАЛГАСАХ—18,8 ПРОЦ. І ПА АДНААСОБНЫМ СЭКТАРЫ—15,1 ПРОЦ.

Уборка яравых таксама распачата. КАЛГАСАМІ ЗЖАТА ЯРАВЫХ КУЛЬТУР 0,7 ПРОЦ. ПЛЯНУ, А АДНААСОБНЫМ СЭКТАРАМ—2,4 ПРОЦ.

Ад саўгасаў аб ходзе жніва яравых вестак яшчэ не паступіла.

Такім чынам усяго па БССР зжата азімых і яравых культур на плошчы 204.196 гэкт. або 8,8 проц. уборачнага пляну.

Некаторыя калгасы ўжо закончылі ўборку жыта, распачалі абмалот і здачу таварных пішчаў.

Скончылі ўборку азімых

КАМАРЫНА. (Па тэлеграфу). Калгасы і аднаасобнікі Камарынскага раёну скончылі ўборку азімых і пераключыліся на ўборку тэхнічных культур, і падрыхтоўку да асеньняй сяўбы.

Раённы штаб.

Перадавыя калгасы пачалі абмалот

БУДА-КАШАЛЁЎСКАЯ. Буда-Кашалёўскі р. уключыўся ў барацьбу за ўдарнае правядзеньне ўборкі ўраджаю. Створаны райштаб. Усе арганізацыі р-ну выслалі калгасы свае брыгады на праверцы разгортваньня ўборкі і дапамозе калгасам.

Некаторыя калгасы раёну паказваюць узоры бальшавіцкіх тэмпаў правядзеньня ўборкі. Так, калгас «Чырвоная Беларусь» скончыў уборку азімых, а зараз праводзіць абмалот збожжа. Сенаўборка ў калгасе скончыцца не пазьней жніўня.

25-га ліпеня калгас «Чырвоная Беларусь» арганізаваў чырвоны абоз збожжа.

СТОШ Я.

Жыткавічы заканчваюць уборку жыта і сенажацей

ЖЫТКАВІЧЫ. (Па тэлеграфу). Заканчваем уборку жыта і сенажацей. Ліпеня чырвонымі абозамі прыбыла [illegible] вазоў сена. Рыхтуем масавыя абозы [illegible] і збожжа.

РК КП(б)Б і РВК

Пастанова НКЗ і Калгасцэнтру не прапрацавана, п[illegible]севы не аграмаджаны

ГОМЕЛЬ. У калгасах «Чырвоны ба[illegible]» і «Чырвоны гаспадар», Гомельскага р[illegible]ну, яшчэ не распрацавана пастан[illegible] Наркамзему СССР і Калгасцэнтру [illegible] прыкладным разьмеркаваньні даход[illegible]. Азімыя пасевы ў гэтых калгасах не [illegible]рамаджаны і ніякай масавай работы [illegible]даным напрамку не вядзецца.

А. КАЦ

Па-баявому рыхтавацца да навучальнага году

ПРАЗ МЕСЯЦ павінен пачацца новы навучальны год. Моладзь з вытворчасьці, саўгасаў і калгасаў увальецца ў ФЗВ, тэхнікумы, ВНУ для таго, каб пасьля вучобы стаць тэхнічна ўзброенымі і палітычна падкаванымі кіраўнікамі паасобных галін народнай гаспадаркі.

Надыходзячы навучальны год зьяўляецца рашаючым у справе ўвядзеньня ўсеагульнага навучаньня і завяршэньня ліквідацыі няпісьменнасьці сярод працоўных мас БССР.

Выкананьне пляну ўсеагульнага навучаньня і ліквідацыя няпісьменнасьці створаць магутную базу для хутчэйшага вырашэньня праблемы кадраў.

Усё гэта высоўвае падрыхтоўку да навучальнага году ў рад першачарговых баявых задач партыі і ўсёй савецкай грамадзкасьці.

Аднак, тэмпы і размах гэтай работы на сёньняшні дзень яўна нездавальняючыя, яны ня могуць забясьпечыць поўнага выкананьня задач, вызначаных ЦК КП(б)Б.

Гэта стане асабліва відавочным, калі праверыць становішча падрыхтоўкі падручнікаў, набору адпаведнага кантынгенту ў навучальныя ўстановы, калі праверыць стан школьнага будаўніцтва і рамонту.

У сярэдняй навучальныя ўстановы трэба прыняць 2.850 чалавек. Для гэтага рыхтуюцца праз курсы 1.112 чал., самацёкам паступіла 425 заяў. Такім чынам, не хапае 1.313 чалавек.

Ня пепш стаіць справа з наборам ва ўсе ВНУ, якія знаходзяцца пад ведамам НК Асьветы.

Плянам Наркамасьветы прадугледжан выпуск 63 падручнікаў рознага раду. На сёньня выйшлі з друку толькі 23 падручнікі. Рэшта часткова знаходзіцца ў БДВ, часткова—у мэтадкоме і нават у аўтараў. Друкаваньне і выпуск падручнікаў для школ нацменшасьцяй прасоўваецца яшчэ больш марудным тэмпамі.

«Рад устаноў, у прыватнасьці Белкалгасаюз, Белдзяржснаб, Белкалгасцэнтр, ня выканалі дырэктыў партыі і ўраду па выкананьні падрыхтоўкі да новага навучальнага году (у прыватнасьці па [illegible]льнаньні вопратнай, абуткам і г. [illegible] асабліва нездавальняючым ста[illegible]ходзіцца школьнае будаў[illegible]нага не мабілізаваны [illegible] грамадзкасьці». Так [illegible] падрыхтоўкай [illegible] сёньня дру[illegible]

[illegible]ны

[illegible]ня патрабуюць, каб ужо зараз была разгорнута работа па ўліку малапісьменных і няпісьменных, па ўліку дзяцей школьнага ўзросту. Ужо зараз Белдзяржвыдавецтва, Наркамснаб, Белкалгасаюз павінны разгарнуць шырокую падрыхтоўчую работу па забясьпячэньні школ падручнікамі і іншымі прыладамі, а таксама вучняў—вопраткай і абуткам.

Несвячасовы рамонт, зацяжка з будаўніцтвам як школьных, так і жыльлёвых будынкаў могуць зьвяліца сур'ёзным тормазам у справе сваячасовага пачатку навучаньня. На ліквідацыю гэтага тормазу трэба мабілізаваць сілы, сродкі і энэргію ўсёй савецкай грамадзкасьці.

Пачатак надыходзячага навучальнага году—гэта пачатак рашучага ажыцьцяўленьня ІДЭЙ ПАЛІТЭХНІЗАЦЫІ ва ўсёй сыстэме народнай асьветы. Таму такія мерапрыемствы, як прымацаваньне школ да заводаў, саўгасаў, калгасаў, МТС, праверка заключаных умоў, абсталяваньне майстэрань, арганізацыя дасьледчых школ і інш., патрэбна правесьці зараз. Гэтым мерапрыемствам павінна быць надана вялікае палітычнае значэньне.

«Выкананьне гэтых вялізарных задач можа быць забясьпечана толькі пры ўмове пастаноўкі іх, як баявых палітычных задач, пры актыўным удзеле усёй КП(б)Б, камсамольскай арганізацыі, усіх асьветнікаў і найшырэйшай пралетарскай грамадзкасьці».

Пастанова сакратарыяту ЦК КП(б)Б аб камандыраваньні на ўборачную кампанію

1. Камандыраваць ушаўнаважанымі ЦК КП(б)Б на жнівень месяц у раёны на ўборачную кампанію наступных таварышоў:

Альпяровіч, Жук, Гусеў (Дзяржплян); Марусевіч, Кажэўнікаў (НК Сацыяльнага Забесьпячэньня); Шустэр, Шымаюк (Наркампрацы); Шчарбакоў, Садоўскі, Канаплін, Шапавалаў, Ганчарык, Гешаў (БАН); Адамчук К., Казлоўскі (ЦВК БССР); Жураўлёў, Анташэўскі, Шукевіч, Каменеў (Нарсувязь); Пішчыкаў, Аўдзіевіч, Піцюкевіч, Штайер, Жылінскі (НКЮ); Мельнікаў (Дзяржгандальбел); Дзгін (Пушсындыкат); Чарот, Любіч (БДВ); Краўчук (Белдзяржкіно); Гальперын, Сушкевіч (Белдзяржсьпірт); [illegible] (НК аховы здароўя); [illegible]); Элькінд, Сулкоўскі, Носаў (СНК); Краўчанка, Шумілаў, Стасевіч, Карпусенка, Мякінік, Мацюшка (ЦП саюзу рабочых жывёлагадоўчых саўгасаў); Жывіцкі (ЦП саюзу рабочых МТС); Гладыш, Рахтоўскі (ЦП саюзу рабочых МТС); Лашко (ЦП саюзу зямляробчых саўгасаў); Ошараў, Брытневіч, Чорнабродаў, Хмыс (НКА); Ратайка, Калмык, Грыневіч, Номаль, Нямцэвіч, Чарняўскі (Калгасцэнтр); Кіпеньварыц, Яцкевіч, Сідаровіч, Самусевіч (НКЗ); Вопсах (ЦКК).

2. 31 ліпеня ў 7 гадзін ў памяшканьні ЦК (малая заля) склікаць нараду адказных работнікаў на ўборачную кампанію.

***

Сакратаром ячэек КП(б)Б прасачыць за поўнай і сваячасовай яўкай вылучаных

Сапраўдную барацьбу за мір вядзе толькі Савецкі Саюз

Імпэрыялісты, пры падтрыманьні сацыял і нацыянал-фашыстаў, рыхтуюцца патапіць у крыві першую ў сьвеце пралетарскую дзяржаву—СССР

У ДЗЕНЬ 1 ЖНІЎНЯ, УСЕ НА ВУЛІЦУ, НА МАСАВУЮ ДЭМАНСТРАЦЫЮ У АБАРОНУ КРАІНЫ САВЕТАЎ!

Адозва ЦК КПП, ЦК КПЗБ і ЦК КПЗУ

ДА РАБОЧЫХ, ПРАЦОЎНАГА СЯЛЯНСТВА І САЛДАТ ПОЛЬШЧЫ

Фашысцкі ўрад, пасьля крывавай лазьні на Зах. Украіне, пасьля масавых катаваньняў сялян, гвалтаў над жанчынамі, забойстваў нажараў, разгромаў украінскіх рабоча-сялянскіх арганізацый, падрыхтоўвае такую-ж расправу над працоўнымі Зах. Беларусі. **Ужо паліцэйскія «наезднікі» пры ўдзеле асадзікаў і кулакоў робяць напёты і аблавы, зьбіваюць і калечаць перадавых змагароў вёскі, рабуюць іх маемасьць.**

Таварышы, рабочыя і сяляне Польшчы!

Гаспадарчы крызіс, голад, галеча, беспрацоўе, беззямельле з асаблівай сілай ударыць па працоўных ЗБ і ЗУ, якія церпяць **падвойны ўціск**—польскай і сваёй буржуазіі. Урад супольна з польскімі і мясцовымі памешчыкамі, ваеннымі асадзікамі праводзіць дзіку грабежніцкую поўкалёніяльную палітыку. Падрыхтоўваючыся да вайны супроць СССР, урад ператварыў ЗБ і ЗУ ў ваенны лягер, навадніў паліцыяй, шпікамі і рукамі галодных, зьбяднёўшых мас узмоцнена праводзіць будаўніцтва дарог, мастоў і іншых стратэгічных пабудоў.

Беспрацоўе, пастаянны голад, беззямельле, павальная эпідэмія, упадак прамысловасьці, грабеж прыродных багацьцяў краіны—вось рэзультаты 12-гадовага гаспадараньня фашысцкай анупацыі на ЗБ. Паводка гэтага году забрала і зруйнавела апошнія мізэрныя рэшткі, пакінуўшы дзесяткі тысяч сем'яў без хлеба, даху, жывога і мёртвага інвэнтару, са змытымі пасевамі, нягодными сенажацямі.

Урад вайны, тэрору і акупацыі рэквізуе за падаткі і штрафы апошні хатні скарб, праводзіць гвалтоўную калёнізацыю, прасьледуе беларускую мову, закрывае беларускія школы. У фашысцкіх казэматы кінуты **Тарашкевіч, Гаўрылін і іншыя**, якія разам з польскімі рабоча-сялянскімі паслалі абаранялі інтарэсы працоўных мас Польшчы, у турмах томяцца лепшыя прадстаўнікі беларускага народу, якія змагаюцца за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне працоўных мас ЗБ. **У фашысцкіх засьценках рабочыя і сяляне ЗБ тысячамі нечалавечна мучацца і катуюцца, іх там калечаць на ўсё жыцьцё, асуджваюць на доўгія годы турмы.**

Польская буржуазія, аграбіўшы беларускія і украінскія землі, хоча гэтай акупацыяй умацаваць сваё панаваньне. Польскай буржуазіі мала поту і крыві сваёй рабочай клясы і сялянства, яна працягвае свае драпежніцкія папы і да УССР і БССР, каб адняць у рабочых і сялян сацыялістычных рэспублік фабрыкі, лясы і зямлю, каб за кошт эксплёатацыі новых мас выратаваць сваю гаспадарку ад крызісу, каб умацавацца ў барацьбе супроць рэвалюцыйнага руху ў Польшчы.

Таварышы! Чым мацней вораг, тым мацней б'е бізун капіталістычнай эксплёатацыі па вашых сьпінах. Але ў барацьбе супроць агульнага ворага—фашысцкай дыктатуры, вы маеце надзейных саюзьнікаў.

Працоўныя масы ЗБ, кінутыя ў бяздонье, галечы і роспачы, змагаюцца не на жыцьцё, а на сьмерць супроць фашысцкага ўраду, супроць эксплёататарскіх пануючых кляс, у тым ліку і супроць сваёй буржуазіі. Няпавісьць і абурэньне супроць фашысцкага рэжыму ўсё часьцей выяўляецца ў **падпалах паліцэйскіх «пастэрункаў», пошт, майнткаў памешчыкаў, асадзікаў і беларускіх кулакоў.** Побач з гэтым ідзе арганізаваная штодзённая барацьба супроць падаткаў, супроць шарварак, супроць фашысцкай акупацыі.

Працоўныя масы ЗБ усё больш пранікаюцца сьвядомасьцю, што **толькі ў масавай бязьлітаснай барацьбе, у цесным саюзе з працоўнымі масамі ўсёй Польшчы, пад кіраўніцтвам кампартыі, ляжыць шлях да заваяваньня фабрык, зямлі, да нацыянальнага вызваленьня беларускага народу.**

Полымя рэвалюцыі, якое разгараецца, фашысцкі ўрад хоча патапіць у крыві, хоча шляхам карных экспэдыцый на так званых «крэсах» забясьпечыць сабе тыл у вайне, што падрыхтоўваецца супроць СССР.

Пралетары Варшавы, Лодзі, Дамбровы, Верхняй Сілезіі, рабочыя і сяляне ўсёй Польшчы!

Ваша барацьба непасрэдна ўдарае ва ўстоі капіталізму, сілай вашага контрнаступленьня прымусьце ворага спыніць карныя экспэдыцыі на ЗБ, папярэдзьце гэтым-ж экспэдыцыі ў самой Польшчы. Няхай адказам на карныя экспэдыцыі будзе ваша магутная кампанія пратэсту, магутная барацьба авангарду за нацыянальнае вызваленьне прыгнечаных і паняволеных народаў. Памятайце, што без вызваленьня рабочых і сялян ЗБ і ЗУ ад ярма фашысцкай акупацыі і вы ня можаце быць свабодны. Ня можа быць свабодны народ, які прыгнятае другія народы, ня можа, бо нацыянальнае прыгнечаньне толькі ў інтарэсах пануючых кляс, у інтарэсах памешчыкаў, капіталістаў і іх дзяржавы.

Усюды, дзе буржуазія на чале ўлады, яна, побач з надзвычайнай эксплёатацыяй сваёй рабочай клясы і сялянства, паваліўшае свае багацьці за кошт няволі і жудаснага ўціску прыгнечаных народаў. Толькі ў адной краіне, дзе на чале ўлады стаіць рабочая кляса, пасьлядоўна праводзіцца ленінскі лёзунг права нацый на самавызначэньне аж да аддзяленьня, права кожнага народу на свабоднае разьвіцьцё сваёй культуры, мовы і школы.

Гэты лёзунг, наказаны Леніным, накрэсьлен на нашых сьцягах, на сьцягах камуністычнай партыі Польшчы.

Цяперашняя Польшча зьяўляецца Польшчай фашысцкай дыктатуры, Польшчай барбарскай эксплёатацыі і зьдзекаў над шырокімі працоўнымі масамі, Польшчай—турмой для народаў. Супроць гэтай буржуазнай фашысцкай Польшчы змагаюцца разам з рабочымі і сялянамі ўсёй Польшчы і рабочыя і сяляне Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Рабочыя і сяляне Польшчы! Памятайце, што іх барацьба—гэта ваша барацьба, таксама, як вашы гэраічныя выступленьні супроць капіталу і фашызму даюць ім сьвежую сілу і бадзёрасьць, натхняюць іх на новыя рэвалюцыйныя выступленьні супроць ненарэсных прыгнятальнікаў.

Урад капіталістаў, памешчыкаў—урад фашысцкай дыктатуры імкнецца па частках разьбіць рэвалюцыйны рух рабочых і сялян усёй Польшчы. У гэтым ім старанна дапамагаюць сацыял і нацыянал-фашысты як польскія, так і беларускія. Яны ўсямерна дапамагаюць пануючым клясам і фашысцкаму ўраду ў падрыхтоўцы вайны, яны разьбіваюць рэвалюцыйны рух, яны зрываюць адзіны фронт працоўных мас усіх нацыянальнасьцяй, яны разьбіваюць агульну барацьбу рабочае клясы, сялянства і прыгнечаных нацыянальнасьцяй супроць фашызму. А ў рашаючы момант яны актыўна становяцца на бок сваёй буржуазіі супроць рэвалюцыі, як гэта мела месца ў 1920 годзе ў часе польска-савецкай вайны.

Не народ супроць народу, а кляса супроць клясы, барацьба рэвалюцыйнага лягеру супроць фашысцкага, рашучая барацьба працоўных мас кожнай нацыянальнасьці супроць сваёй буржуазіі.

Толькі ў супольнай рэвалюцыйнай барацьбе, цесным саюзе польскіх, украінскіх, беларускіх, яўрэйскіх і іншых працоўных усіх нацыянальнасьцяй, супроць аб'яднаных сіл буржуазіі, толькі ва ўзброеным зьвяржэньні фашысцкай дыктатуры і ўстанаўленьні дыктатуры пралетарыяту—пяжыць рэвалюцыйны выхад з крызісу, які ўсё больш паглыбляецца, з голаду, беспрацоўя, галечы.

Пралетары Польшчы! **Заклік да рэвалюцыйнага падтрыманьня сьцякаючых крывёю ЗБ і ЗУ павінен знайсьці гарачы водгук у вашых радах.** Памятайце, што змагаючыся за сваё вызваленьне, вы адначасова змагаецеся за вызваленьне ўсіх прыгнечаных і паняволеных, за вызваленьне прыгнечаных народаў, якія стогнуць пад уціскам фашысцкай акупацыі. Умацніце барацьбу пад кіраўніцтвам кампартыі супроць фашысцкай дыктатуры, дайце адпор наступленьню капіталістаў і памешчыкаў. Ня дайце ўмацавацца панаваньню капіталістаў і памешчыкаў за кошт голаду, беспрацоўя, паняволеньня шырокіх працоўных мас як Польшчы, так і Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Працоўныя сяляне Польшчы! Вас таксама, як сялян ЗБ і ЗУ грабіць фашысцкі ўрад, дзярэ в вас падаткі, гвалтоўна гоніць на шварркі, катуе ў дэфэнзывах, вам таксама пагражаюць карныя экспэдыцыі. Супольна з працоўнымі сялянамі ЗБ і ЗУ—ні граша падатку ўраду голаду, тэрору і вайны. **Далоў шварркі! Зямля бяз выкупу сялянам!**

Таварышы польскія салдаты! Не страляйце ў сваіх братоў—украінскіх і беларускіх рабочых і сялян. Ва ўсіх масавых выступленьнях пераходзьце на бок рабочых і сялян і абараняйце іх.

Далоў фашысцкую «пацыфікацыю»—крывавыя экспэдыцыі, накіраваныя супроць самых шырокіх працоўных мас.

Рукі прэч ад ЗБ і ЗУ! Барацьба за вызваленьне прыгнечаных народаў, барацьба супроць нацыянальнага ўціску—справа ўсіх працоўных Польшчы. Няхай жыве права на самавызначэньне прыгнечаных народаў аж да адарваньня! Далоў акупацыю ЗБ і ЗУ!

Далоў падрыхтоўку вайны супроць СССР! Усе на абарону краіны, дзе будуецца сацыялізм!

Далоў фашысцкую дыктатуру і яе агентаў—сацыял і нацыянал-фашыстаў!

Няхай жыве сацыялістычная рэвалюцыя ў Польшчы!

Няхай жыве кампартыя—адзіны правадыр усіх эксплёатаваных і прыгнечаных мас!

ЦК КПП, ЦК КПЗБ, ЦК КПЗУ.

НА АБАРОНУ СССР

„ПЕРАХОДЗЬЦЕ ПАД РЭВАЛЮЦЫЙНЫЯ ШТАНДАРЫ КАМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ ЗАХ. БЕЛАРУСІ"

Да ўсёй рабочай і сялянскай моладзі! Да салдат польскай арміі!

Таварышы! Рэвалюцыйныя рабочыя і сяляне ўсяго сьвету праводзяць міжнародны дзень барацьбы супроць небясьпекі імпэрыялістычнай вайны. У гэты дзень маладыя рабочыя і сяляне разам з усімі працоўнымі Польшчы і Заходняй Беларусі выйдуць на вуліцы нашых гарадоў і вёсак, каб дэманстраваць супроць беспрацоўя, голаду і галечы супроць беспрацоўя, голаду і галечы, супроць антысавецкіх крывавых нападаў імпэрыялістаў.

Фашысцкая Польшча, як і ўвесь капіталістычны сьвет, перажывае цяжкі эканамічны крызіс. Увесь цяжар гэтага крызісу з усёй сілай надае на плечы рабочых і сялян, а перш за ўсё на плечы працоўнай моладзі: галодныя заробкі, 12-16 гадзінны рабочы дзень, самая жорсткая эксплёатацыя з боку фабрыкантаў, майстроў, гаспадароў, абшарнікаў і кулакоў, непамерны цяжар падаткаў, штрафаў, шварак і малазямельля, жорсткі нацыянальны ўціск.

Фашысцкі ўрад, рыхтуючыся да вайны, з кожным днём узмацняе крывавы тэрор. Тысячы маладых рабочых і сялян кінуты ў вастрогі, іх катуюць і калечаць. Жорстка прасьледуюцца ўсе рэвалюцыйныя арганізацыі моладзі, **на вёсках Зах. Беларусі ўжо шалеюць карныя экспэдыцыі.**

Фашысцкі ўрад шукае выхаду з крызісу ў вайне з СССР. Ён хоча задушыць вогнішча сусьветнай рэвалюцыі, краіну рабочых і сялян, дзе няма крызісу, **няма беспрацоўя**, дзе рабочая і сялянская моладзь разам са старэйшымі будуе сацыялізм.

Капіталісты і абшарнікі! Імкнуцца таксама патапіць у моры крыві магутна ўздымаючыяся і ўзрастаючы з кожным днём рэвалюцыйны рух ва ўсёй Польшчы і на Зах. Беларусі.

Таварышы, маладыя рабочыя і сяляне! Фашысцкая Польшча ўзброена з ног да галавы, і кожны дзень гатова кінуцца на Савецкі Саюз. Ня верце буржуазнай і сацыял-фашысцкай балбатні аб міры і разьбраньні. Саюз**ную барацьбу за мір вядзе толькі Савецкі Саюз.** Сапраўдную барацьбу супроць імпэрыялістычнай вайны вядуць рабочыя і сяляне рэвалюцыйнага сьвету **пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі.** Да гэтай барацьбы супроць новай контр-рэвалюцыйнай вайны, якую рыхтуюць капіталісты і абшарнікі, заклікае вас **камсамол ЗБ.** Памятайце, што вы першымі станеце ахвярамі гэтай вайны. Мільёны моладзі загінуць, мільёны будуць пакалечаны, атручаны атрутнымі газамі ў імя ўзбагачэньня капіталістаў і абшарнікаў.

Польскія фашысты, каб зрабіць з моладзі сьляпую прыладу ў сваіх руках, каб выхаваць яе ў духу нянавісьці да СССР, каб адцягнуць яе ад рэвалюцыйнай барацьбы, закладваюць па гарадох і вёсках свае контр-рэвалюцыйныя арганізацыі, як **«Стрэлец», «Зьвёнзак młodzieży wojskowej», «Гашомер»** і іншыя. Усе маладыя рабочыя і сяляне павінны выйсьці з радоў гэтых арганізацый і не дапускаць да закладваньня новых.

Маладыя рабочыя і сяляне! Памятайце, што правадыры сацыял-фашысцкіх арганізацый моладзі—«Тур'ур», «Цу кунфту», «Сева» і іншых існуючых пры дапамозе фашысцкага ўраду, дапамагаюць капіталістам і абшарнікам разьбіваць рэвалюцыйную барацьбу моладзі. **Гэтыя замаскаваныя агенты фашызму зрываюць забастоўку моладзі, разьбіваюць яе арганізацыі, дапамагаюць фашызаваць і мілітарызаваць моладзь, каб уцягнуць яе ў ваенную палітыку ўраду, каб выхаваць яе ў духу нянавісьці да Савецкага Саюзу.** Ганеце прэч сваіх контр-рэвалюцыйных правадыроў. Пераходзьце пад рэвалюцыйныя штандары камуністычнага саюзу моладзі Заходняй Беларусі!

Толькі штодзённая барацьба ўсёй рабочай і сялянскай моладзі ў адных супольных радох з вашымі старшымі братамі, пад баявымі сьцягамі камуністычнай партыі і КСМ, можа перакрэсьліць і сарваць пляны польскага імпэрыялізму.

Маладыя рабочыя і сяляне! усе на мітынгі і дэманстрацыі ў дзень 1 жніўня. Праводзьце палітычныя забастоўкі, арганізуйце дружыны масавай самаабароны.

САЛДАТЫ ПОЛЬСКАЙ АРМІІ!

Польскі фашызм рыхтуе вас на гарматнае мяса. У інтарэсах польскіх і міжнародных капіталістаў і абшарнікаў вас пашлюць на сьмерць. У дзень 1 жніўня разам з атрадамі рабоча-сялянскай самаабароны прымайце ўдзел у агульных дэманстрацыях рабочых і сялян, абараняйце вашых братоў ад нападаў паліцыі і фашысцкіх банд.

ДАЛОЎ ВАЕННЫЯ ПАДРЫХТАВАНЬНІ ПОЛЬСКІХ І МІЖНАРОДНЫХ ІМПЭРЫЯЛІСТАЎ! У АБАРОНУ СССР!

НЯХАЙ ЖЫВЕ СУПОЛЬНАЯ БАРАЦЬБА МАЛАДЫХ РАБОЧЫХ І СЯЛЯН СУПРОЦЬ НАСТУПЛЕНЬНЯ КАПІТАЛУ, СУПРОЦЬ ЗДРАДНІЦКІХ ПРАВАДЫРОЎ З САЦЫЯЛ-ЗГОДНІЦКІХ АРГАНІЗАЦЫЙ!

Няхай жыве камсамол Заходняй Беларусі і ўсёй Польшчы—кіраўнік барацьбы працоўнай моладзі!

Няхай жыве камуністычная партыя—**правадыр усіх эксплёатаваных і прыгнечаных мас!**

Далоў фашысцкую польскую акупацыю Заходняй Беларусі!

Няхай жыве права на самавызначэньне прыгнечаных народаў аж да аддзяленьня!...

Няхай жыве пралетарская рэвалюцыя ў Польшчы!

ЦЭНТРАЛЬНЫ КАМІТЭТ КАМУНІСТЫЧНАГА САЮЗУ МОЛАДЗІ ЗАХАДНЯЙ БЕЛАРУСІ.

Рабочыя заводу „Камунар" падпісваюць адозву да працоўных Зах. Беларусі.

у якой запрашаюць іх прыслаць дэлегацыю на Кастрычніцкія ўрачыстасьці.

Да рабочых і працоўнага сялянства Заходняй Беларусі

Ліст рабочых Гомсельмашу

Дарагія таварышы!

У трэці раз мы сьвяткуем міжнародны чырвоны дзень — 1-га жніўня. У гэты дзень земная куля — эд брудных зямлянак нявольнікаў Індыі, да дашчатых катухоў беспрацоўных Польшчы, Нямеччыны, ад нэгрыцянскіх галодных абязьдоленых пляменьняў, да кітайскіх савецкіх правінцый — пакрываецца чырвонымі сьцягамі гэраічнай барацьбы пад кіраўніцтвам камуністычных партый, магутнымі дэманстрацыямі, усеагульнымі забастоўкамі рабочае клясы.

Кожны дзень нашай гэраічнай работы па сацыялістычным будаўніцтве Саюзу Саветаў, ножнае вашае гэраічнае выступленьне супроць сваіх клясавых ворагаў — фабрыкантаў і памешчыкаў набліжаюць сусьветную рэвалюцыю, набліжаюць сусьветны Кастрычнік.

Рабочая кляса і працоўнае сялянства Савецкага Саюзу, пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі і яе ленінскага ЦК на чале з т. Сталіным, дабіліся гіганцкіх, у гісторыі нязнаных рашаючых перамог у сацыялістычным будаўніцтве.

Большая палова пяцігадовага пляну ператворана ў жыцьцё. Завяршаецца капэктывізацыя асноўных збожжавых раёнаў і на гэтай базе ліквідуецца кулацтва як кляса. Тысячы новых сацыялістычных фабрык і заводаў уступілі ў строй. БССР — некалі цёмная і адсталая краіна, становіцца перадавой бальшавіцкай індустрыяльна-калгаснай краінай. З посьпехам выконваецца праграма 3-га рашаючага году пяцігодкі па закладцы падмурку сацыялістычнай эканомікі. Толькі за першую палову 1931 году пушчаны ў БССР 183 новыя гіганты індустрыі, а дзесяткі — у БССР.

Наш завод „Гомсельмаш" — адзін з гігантаў савецкага машына-будаўніцтва, АДЗІН З ПЕРШЫХ У БУЙНОЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ІНДУСТРЫІ НЯ ТОЛЬКІ Ў МАШТАБАХ БССР, АЛЕ І ВА ЎСЕСАЮЗНЫМ. Наш завод абсталяваны паводле АПОШНЯГА СЛОВА ТЭХНІКІ.

На нас ускладзена адказьнейшая задача, забясьпечыць саўгасы і калгасы Савецкай Беларусі і інш. рэспублік Савецкага Саюзу сельска-гаспадарчымі машынамі. **МЫ ПАВІННЫ ДАЦЬ ЗА ГОД 50 МІЛЬЁНАЎ РУБЛЁЎ ВЫСОКАЯКАСНАЙ ПРАДУКЦЫІ.**

Гэраічнымі намаганьнямі рабочых, эд нэгрыцянскіх галодных абязьдоленых пляменьняў, да кітайскіх савецкіх правінцый — пакрываецца чырвонымі сьцягамі гэраічнай барацьбы пад кіраўніцтвам камуністычных партый, магутнымі дэманстрацыямі, усеагульнымі забастоўкамі рабочае клясы.

Кожны дзень нашай гэраічнай работы па сацыялістычным будаўніцтве Саюзу Саветаў, ножнае вашае гэраічнае выступленьне супроць сваіх клясавых ворагаў — фабрыкантаў і памешчыкаў набліжаюць сусьветную рэвалюцыю, набліжаюць сусьветны Кастрычнік.

Рабочая кляса і працоўнае сялянства Савецкага Саюзу, пад кіраўніцтвам камуністычнае партыі і яе ленінскага ЦК на чале з т. Сталіным, дабіліся гіганцкіх, у гісторыі нязнаных рашаючых перамог у сацыялістычным будаўніцтве.

Большая палова пяцігадовага пляну ператворана ў жыцьцё. Завяршаецца капэктывізацыя асноўных збожжавых раёнаў і на гэтай базе ліквідуецца кулацтва як кляса. Тысячы новых сацыялістычных фабрык і заводаў уступілі ў строй. БССР — некалі цёмная і адсталая краіна, становіцца перадавой бальшавіцкай індустрыяльна-калгаснай краінай. З посьпехам выконваецца праграма 3-га рашаючага году пяцігодкі па закладцы падмурку сацыялістычнай эканомікі. Толькі за першую палову 1931 году пушчаны ў БССР 183 новыя гіганты індустрыі, а дзесяткі — у БССР.

Наш завод „Гомсельмаш" — адзін з гігантаў савецкага машына-будаўніцтва, АДЗІН З ПЕРШЫХ У БУЙНОЙ САЦЫЯЛІСТЫЧНАЙ ІНДУСТРЫІ НЯ ТОЛЬКІ Ў МАШТАБАХ БССР, АЛЕ І ВА ЎСЕСАЮЗНЫМ. Наш завод абсталяваны паводле АПОШНЯГА СЛОВА ТЭХНІКІ.

**

БАЯВАЯ ЗАДАЧА КАЛГАСАЎ:

у бліжэйшыя дні скончыць падпіску сярод калгасьнікаў, узяць на буксір аднаасобны сэктар

На 25 ліпеня па калгасах рэалізавана 71,3 проц. заданьня, сярод аднаасобнікаў—толькі... 2,1 проц.

АПЭРАЦЫЙНАЯ ЗВОДКА

аб ходзе рэалізацыі пазыкі

ПАВОДЛЕ ДАНЫХ НАРКАМФІНУ НА 25-га ЛІПЕНЯ АГУЛЬНЫ ПЛЯН РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ ІМЯ 3-га РАШАЮЧАГА ГОДУ ПЯЦІГОДКІ ПА БССР ВЫКАНАН НА 72,1 ПРОЦ. ПА ГОРАДЗЕ ПЛЯН ВЫКАНАН НА 104,5 ПРОЦ. ПА ВЕСЦЫ НА 19,4 ПРОЦ.

САМЫМ АДСТАЛЫМ ВУЧАСТКАМ РЭАЛІЗАЦЫІ ЗЬЯЎЛЯЕЦЦА АДНААСОБНЫ СЭКТАР ВЁСКІ. У ТОЙ ЧАС, КАЛІ ПА КАЛГАСАХ РЭАЛІЗАВАНА ЎЖО 71,3 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ, АДНААСОБНЫ СЭКТАР ДАЎ ТОЛЬКІ... 2,1 ПРОЦ. ГЭТАЕ НЕДАПУШЧАЛЬНАЕ АДСТАВАНЬНЕ АДНААСОБНАГА СЭКТАРУ — ВЫНІК НАДЗВЫЧАЙ СЛАБОЙ РАБОТЫ БОЛЬШАСЬЦІ РАЕННЫХ АРГАНІЗАЦЫЯЎ СЯРОД БЕДНЯКОЎ І СЕРАДНЯКОЎ — АДНААСОБНІКАЎ. МАСАВА-РАСТЛУМАЧАЛЬНАЯ РАБОТА АБ ЗНАЧЭНЬНІ РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ Ў ГЭТЫМ СЭКТАРЫ НЕ РАЗГОРНУТА.

КЛІМАВІЦКІ РАЁН ВЫКАНАЎ ЗАДАНЬНЕ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ НА ВЁСЦЫ НА 120 ПРОЦ., КОЙДАНАЎСКІ — НА 101,7 ПРОЦ. НАБЛІЖАЕЦЦА ДА ВЫКАНАНЬНЯ ЗАДАНЬНЯ МЕНСКІ РАЁН (88,7 ПРОЦ.).

ЗНАЧНАЯ ЧАСТКА РАЁНАЎ ГАНЕБНА ЦЯГНЕЦЦА Ў ХВАСЬЦЕ РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ НА ВЁСЦЫ. ТАК, БЫХАЎСКІ, БАРЫСАЎСКІ, ВЕТКАЎСКІ, ГАРАДОЦКІ, ДУБРОВЕНСКІ, ЕЛЬСКІ, ЖЛОБІНСКІ, КЛІЧАЎСКІ, ЦЕРАХАЎСКІ І ІНШ. РАЁНЫ ДА ГЭТАГА ЧАСУ РЭАЛІЗАВАЛІ ТОЛЬКІ АД 1 ДА 10 ПРОЦ. ЗАДАНЬНЯ. У ГЭТЫХ РАЁНАХ ЯЎНА НЕДААЦЭНЬВАЮЦЬ ПАЛІТЫЧНА-ГАСПАДАРЧАЯ ВАЖНАСЬЦІ КАМПАНІІ. РАЁННЫЯ АРГАНІЗАЦЫІ, І Ў ПЕРШУЮ ЧАРГУ ФІНОРГАНЫ, ПРОСТА БЯЗЬДЗЕЙНІЧАЮЦЬ.

Вопыт Самахвалавіч--ва ўсе сельсаветы

У Камісіі садзейнасьці дзяржкредыту і праўленьні калгасаў Самахвалавіцкага сельсавету разгарнулі вялікую работу па рэалізацыі пазыкі.

Ва ўсіх калгасах былі скліканы сходы калгасьнікаў. У буйных калгасах праводзіць на некалькі сходаў. Самы буйны ў сельсавеце калгас «Ленінскі шлях» (263 двары), які складаецца з 8 аддзяленьняў, правёў 8 сходаў.

На адным сходзе 3-га аддзяленьня калгасу «Ленінскі шлях» (вёска Белілы), усе калгасьнікі, якія былі на сходзе, поўнасьцю падпісаліся на пазыку. На іншых сходах падпіска ішла больш слаба.

Тады члены праўленьняў калгасаў і камсадаў пачалі абходзіць палі і тут-жа на полі ў-абедзены перапынак у гутарцы з касцамі і жнеямі праводзілі падпіску. Каго не заставалі на полі, хадзілі на дом.

У калгасах разгарнулася сацыялістычнае спаборніцтва. Калгасьнікі пачалі выклікаць адзін другога на лепшую падпіску.

У самым цэнтры мястэчка Самахвалавічы быў вывешан плякат, на якім адзначаўся ход спаборніцтва на лепшую падпіску. Буйнымі літарамі былі выстаўлены прозьвішчы больш перадавых у падпісцы калгасьнікаў.

Асабліва добра прайшла падпіска ў калгасе «Ленінскі шлях». Самаабавязацельствы сходу калгасьнікаў аб тым, што з кожнага двара падпісваецца мінімум 1 чалавек ня менш чым на 25 руб., былі перавыкананы.

Горш праходзіла падпіска ў калгасе імя Беларускай Акадэміі Навук. Падпіскай ахапілі ўсяго 23 калгасьнікаў (а двароў у калгасе 51) на суму 695 руб.

Забілі трывогу. І тады першае аддзяленьне калгасу «Ленінскі шлях» паравозіла ўзяць на буксір адстаючы калгас «БАН». З плякатамі прышлі калгасьнікі «Ленінскага шляху» ў калгас «БАН». Склікалі агульны сход калгасьнікаў «БАН'у», прыцягнулі да ўдзелу настаўнікаў.

67 калгасьнікаў «БАН» падпісаліся на 3.835 руб.—вось канкрэтныя вынікі буксіру. На агульным сходзе ў калгасе «БАН» выступіў калгасьнік Антось Позьняк — серадняк.

— Таварышы,—заявіў ён, я падпісваўся на 70 рублёў і даю 3 пуды жыта на карысьць індустрыялізацыі.

Добра праведзеная работа ў калгасным сэктары Самахвалавіцкага сельсавету дала належныя вынікі. 265 членаў калгасу «Ленінскі шлях» падпісаліся на 9.120 руб. 19 членаў калгасу «КІМ» падпісаліся на 445 руб., 26 калгасьнікаў калгасу імя Будзённага падпісаліся на 1.165 руб., 13 двароў калгасу «Бальшавік» падпісаліся на 405 руб. і г. д. Ц.

УСЕСАЮЗНАЯ ДЭКАДА 6-ці ГІГАНТАЎ

ТРАНСПАРТ ДАЕ СЛОВА:

НЕ ЗАТРЫМЛІВАЦЬ ГРУЗАЎ ДЛЯ ГІГАНТАЎ ІНДУСТРЫІ

НЕ ДАПУСЬЦІЦЬ НІ АДНЭЙ МІНУТЫ ПРАСТОЯЎ МАРШРУТАЎ ДЛЯ МАГНІТАБУДУ

Аршанскія чыгуначнікі прынялі выклік

УДЗЕЛЬНІКІ СХОДУ КАНДУКТАРСКАГА РЭЗЭРВУ СТАНЦЫІ ВОРША ПРЫНЯЛІ ВЫКЛІК ПАРТАРГАНІЗАЦЫІ МЕНСКАГА ВУЗЛА НА САЦСПАБОРНІЦТВА ПА НЕЧАРГОВЫМ ПРАСОЎВАНЬНІ ГРУЗУ ДЛЯ МАГНІТАБУДУ. СХОД УЗЯЎ НА СЯБЕ НАСТУПНЫЯ САМААБАВЯЗАЦЕЛЬСТВЫ:

1. НІВОДНАГА ЗАТРЫМАНЬНЯ НЕ ПАВІННА БЫЦЬ НА ВІНЕ БРЫГАД.

2. ГАЛОЎНЫЯ КАНДУКТАРЫ СОЧАЦЬ ЗА СВАЯЧАСОВАЙ АДПРАЎКАЙ МАРШРУТАЎ МАГНІТАБУДУ, ПАДБІРАЮЦЬ ДАКУМАНТЫ НА ІХ І Г. Д.

СХОД ВЫЛУЧЫЎ АД РЭЗЭРВУ ДАДАТКОВУЮ БРЫГАДУ З 7 ЧАЛ. ПА САДЗЕЙНАСЬЦІ ПЕРАВОЗКАМ ГРУЗАЎ ДЛЯ МАГНІТАБУДУ. ВЫКЛІКАНЫ НА САЦСПАБОРНІЦТВА МК РУХУ І СТАНЦЫІ.

Тры кантрольныя пасты

для праверкі выкананьня дагавору

НЕГАРЭЛАЕ. 29/VII. (БЕЛТА). РАБОЧЫЯ І СЛУЖАЧЫЯ СТАНЦЫІ НЕГАРЭЛАЕ НА АГУЛЬНЫМ СХОДЗЕ АБГАВАРЫЛІ АДКРЫТЫ ЛІСТ РАБОЧЫХ ДОМЕННАГА ЦЭХУ МАГНІТАБУДУ І ВЫКЛІК ПАРТСХОДУ МЕНСКАГА ВУЗЛА НА САЦСПАБОРНІЦТВА ПА ХУТЧЭЙШЫМ ПРАСОЎВАНЬНІ ГРУЗАЎ ДЛЯ МАГНІТАБУДУ. ВЫКЛІК ПРЫНЯТЫ. СХОД АБВЯСЬЦІЎ СЯБЕ МАБІЛІЗАВАНЫМ НА ВЫКАНАНЬНЕ ПАКАЗАНЫХ У АДОЗЬВЕ РАБОЧЫХ МАГНІТАБУДУ ЗАДАЧ.

СА СВАЙГО БОКУ РАБОЧЫЯ І СЛУЖАЧЫЯ СТАНЦЫІ НЕГАРЭЛАЕ ПРЫНЯЛІ 11 ПУНКТАЎ, ПА ЯКІХ БУДЗЕ ПРАХОДЗІЦЬ СПАБОРНІЦТВА НА ХУТЧЭЙШАЕ ПРАСОЎВАНЬНЕ ГРУЗУ МАГНІТАБУДУ І ВЫКЛІКАЎ НА САЦСПАБОРНІЦТВА СТАНЦЫЮ БАРЫСАЎ, ВОРШУ, СМАЛЕНСК І ІНШ. СТАНЦЫІ, ПРАЗ ЯКІЯ БУДУЦЬ ПРАХОДЗІЦЬ ГРУЗЫ ДЛЯ МАГНІТАГОРСКАГА ГІГАНТА.

АРГАНІЗАВАНЫ З КАНТРОЛЬНЫЯ ПАСТЫ ПА СЛУЖБЕ ЦЯГІ, ЭКСПЛЕАТАЦЫІ І ПЕРАГРУЗЦЫ З ЛЕПШЫХ УДАРНІКАЎ РАБОЧЫХ, ЯКІЯ БУДУЦЬ САЧЫЦЬ ЗА ВЫКАНАНЬНЕМ УЗЯТЫХ АБАВЯЗАЦЕЛЬСТВАЎ.

Бабруйскі камбінат

100 ударнікаў--у рады партыі

КАМБІНАТ. (Выязная брыгада «Зьвязды»).

25-та ліпеня па ініцыятыве выязной брыгады «Зьвязды» быў скліканы зьлёт рабкораў камбінату для прапрацоўкі вынікаў 2-га ўсебеларускага зьезду рабселькораў. Да зьлёту пытаньне гэта шырока абмяркоўвалася на зьнешавых сходах. Прапрацоўка выклікала вялікі ўздым творчай актыўнасьці. У выніку 100 лепшых ударнікаў у часе зьлёту падалі заявы аб прыёме ў рады партыі, 45—у камсамол і 130 рабочых унеслі прапановы для паляпшэньня вытворчасьці.

ЛІКВІДАЦЫЯ АБЯЗЬЛІЧКІ

зьменшыла прастоі ў стандартным

За апошнюю пяцідзеўку (з 21 па 26-е) стандартны цэх выпусьціў 12,6 дома. Зрух адбыўся дзякуючы таму, што ліквідавана абязьлічка варштатаў: да кожнага варштату прымацаваны па 4 чал. У выніку значна паменшыліся папомкі варштатаў, а значыць і прастоі. Калі да 20 ліпеня было 48 проц. прастояў з-за папомак, дык пасьля прымацаваньня рабочых да варштатаў прастоі зьнізіліся да 15 проц.

Зараз стандартны цэх, у выніку прапрацоўкі прамовы тав. Сталіна, перавёў усю работу на зьдзельшчыну. Можна спадзявацца, што гэтае мерапрыемства дасьць больш рашучы зрух у ліквідацыі прарыву.

Выязная ўдарная брыгада «Зьвязды»:
Н. НЭЙДЛІН, М. ГЭЛЬФАР.

Дэкада грамадзянскай авіяцыі

ГРАМАДЗЯНСКУЮ АВІЯЦЫЮ

—на ўзровень тэмпаў сацбудаўніцтва

Паветраныя зносіны зьяўляюцца самым маладым відам транспарту, і ня дзіва, што яшчэ некалькі год назад значэньне грамадзянскага паветранага флёту яўна недаацэньвалася шырокімі колямі. За апошні час савецкая грамадзянская авіяцыя. Мы павінны зараз давіцца такога зруху, каб дапамога авіяцыі не насіла эпізадычнага, кампанейскага характару, а стала-б сыстэматычнай.

Савецкі Саюз—краіна, дзе бурнымі тэмпамі праводзіцца рэканструкцыя усёй народнай гаспадаркі, краіна неабмежаваных эканамічных магчымасьцяй, вялізарных адлегласьцяй і бездарожжа,—патрабуе хуткіх сродкаў перасоўваньня, якія можа даць толькі авіяцыя.

Перадавыя капіталістычныя краіны на працягу апошніх год, побач з вялізарным узмацненьнем ваенна-паветраных сіл, пачалі разьвіваць моцную грамадзянскую авіяцыю. Але ў буржуазных краінах грамадзянская авіяцыя зьяўляецца фактарам імпэрыялістычнай палітыкі, паветраныя лініі зьяўляюцца каналамі, шчупальцамі сусьветнага імпэрыялізму.

Зусім іншае значэньне набывае грамадзянскі паветраны флёт у СССР. Авіяцыя ў нас зьяўляецца адным з магутных сродкаў сацыялістычнага будаўніцтва. За апошнія гады ўдзельная вага паветранага флёту значна ЎЗРАСЛА. Сетка паветраных ліній раскідана па ўсім Савецкім Саюзе і з кожным месяцам пашыраецца. Самалёт пракладае сабе шляхі туды, куды яшчэ не пранікнула чыгунка і аўто.

У гэтым годзе ўсе абласныя, рэспубліканскія цэнтры зьвязаны паміж сабою паветранымі лініямі. Ужо адкрыты 1 працуюць Сібірская магістраль, рад ліній на Далёкім Усходзе, у Сярэдняй Азіі, на Поўначы, на Ўрале, Закаўказьзі. Там, дзе зусім нядаўна патрэбна было некалькі дзён і нават тыдняў для пераезду з аднаго пункту на другі, сёньня патрабуецца толькі некалькі гадзін палёту.

Лініі Масква—Берлін, Ленінград—Кенігсберг, Баку—Пэхлеві (Пэрсія), Самарканд—Кабул (Аўганістан), Верхнеудзінск—Улан—Батор (Манголія) злучаюць СССР з суседнімі дзяржавамі.

Авіяцыя знайшла сабе ўжываньне ў народнай гаспадарцы ня толькі, як сродак сувязі.

Барацьба са шкоднікамі сельскай і лясной гаспадаркі шляхам прыстасаваньня самалётаў разьвіваецца ў нас такімі тэмпамі, аб якіх ня могуць і марыць ні ў адной капіталістычнай краіне. Калектывізацыя вёскі і плянаваньне сельскай гаспадаркі далі магчымасьць у мінулым годзе правесьці барацьбу са шкоднікамі на плошчы 70 тыс. гэкт. замест 1.000 у 1925 г.

У гэтым годзе на вучастку барацьбы са шкоднікамі ў нас будзе працаваць на 80 проц. больш самалётаў, чым у ПАЗІІ; будзе апрацавана на 80 проц. больш плошчы, чым у Амэрыцы. Самалёт ужываецца і ў галіне ўпарадкаваньня зямлі і лесу. У 1925 г. «Дзяржаэрафатоздымак» засьняў з самалётаў 920 клм. плошчы, у 1930 г. ужо засьнята 96.340 кв. клм.

З 1926 г. самалёты пачалі абслугоўваць нашы зьверабойныя экспэдыцыі на Белым моры. Вельмі каштоўныя паслугі аказалі самалёты і на рыбалоўных промыслах у галіне выратаваньня морскіх суднаў, якія былі зацёрты лёдам Далёкай Поўначы.

У 1928 г. наш паветраны флёт прыняў самы актыўны ўдзел у экспэдыцыі па адшуканьні і выратаваньні экіпажу дырыжабля «Італія», ён заваяваў сабе тады сусьветную славу.

Вялікія дасягненьні ў галіне авіятэхнікі і аэраіндустрыі адзначаны ўрадам СССР (прэміяваньне работнікаў авіязаводу). Аб гэтых дасягненьнях добра ведаюць і за мяжой.

Усе памятаюць савецкія пераляты ў Зах. Эўропу, Амэрыку і Кітай.

Гэта было некалькі год назад, але-ж авіяцыйная тэхніка разьвіваецца з нячуванай хуткасьцю, і тое, што ўчора было рэкордам, сёньня — звычайнае зьявішча.

Калі ўчора самалёт, які мог падымаць 9 пасажыраў, быў вялікім дасягненьнем савецкай авіяцыі, дык зараз мы будуем самалёты, якія паднімаюць 32 пасажыраў.

Друкаваньне «Правды» ў адзін дзень у розных гарадох СССР шляхам дастаўкі матрыц, сьведчыць аб вялізарным значэньні авіяцыі.

Мы ў бліжэйшыя гады павінны мець ня 80 тыс. клм. паветраных шляхоў, а ў некалькі раз больш. Нам неабходна вялікая колькасьць інжынэрна-тэхнічных сіл для нашай авіяпрамысловасьці.

Савецкі Саюз мае ўсе прадпасылкі для таго, каб разгарнуць вялізарную сетку паветраных ліній у мэтах максымальнага разьвіцьця прадукцыйных сіл краіны і задавальненьня палітычна-культурных запатрабаваньняў рабочае клясы.

Можна ўжо зараз зусім упэўнена гаварыць аб тым, што ў бліжэйшыя 5-10 год кур'ерскія і хуткія цягнікі будуць курсаваць у паветры.

Трэба падкрэсьліць, што спрага будаўніцтва паветранага флёту патрабуе значных затрат матар'яльных рэсурсаў. Задачы, якія пастаўлены перад грамадзянскім паветраным флётам, могуць быць выкананы толькі пры ўмове мабілізацыі вакол гэтай справы ўсёй пралетарскай грамадзянасьці.

— Усямерна прапагандаваць сярод рабочых і сялянскіх мас значэньне грамадзянскага флёту, праводзіць сыстэматычную работу па ўцягненьні сродкаў у авіяцыйнае будаўніцтва, практычна дапамагчы абсталяваньню аэрадромаў і пасадачных пляцовак флёту шляхам правядзеньня масавых суботнікаў, наладзіць кантроль за выкананьнем прамысловасьцю заказаў грамадзянскага паветранага флёту, усямерна ўкараняць авіякультуру ў масы, дабівацца вывучэньня пытаньняў авіяцыі ў школах—задачы ўсёй савецкай грамадзянасьці.

СЕМЯНЮК.

4-ы аб'яднаны рэйд брыгад ЦКК-НК РСІ, „Зьвязды" і „Рабочего"

ПА РЫШТАВАНЬНЯХ ПАБУДОЎ

Слабае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва на будаўніцтве, абязьлічка, невыстарчальная мэханізацыя, цякучасьць рабсілы, слабая масавая работа—асноўныя прычыны прарываў у выкананьні будфінпляну

САБЕКОШТ БУДАЎНІЦТВА НЯ ЗЬНІЖАН

Дом друку скончыць у тэрмін

Для паліграфічнай прамысловасьці Менску ў раёне Камароўкі будуецца вялізны Дом друку. Зараз на гэтай пабудове занята 277 чалавек. Не хапае для плянавай загрузкі будоўлі 120 чалавек. У бліжэйшы час будзе яшчэ патрэбна 250 рабочых. На пабудове было вельмі разьвіта лятуньства.

Грамадзкія арганізацыі правялі групавыя і агульныя сходы, дзе было рэзка пастаўлена пытаньне аб барацьбе з лятунамі. Пасьля гэтага наступіў некаторы пералом.

Некаторыя вучасткі пабудовы пераведзены на тры зьмены. Адчуваецца недахват цесьляроў, гэта перашкаджае правільнаму скарыстаньню рабочых.

Грамадзкая работа сярод будаўнікоў пачалася толькі ў апошні час. Толькі па апошніх сходах завастрылі пытаньне аб спаборніцтве і ўдарніцтве. На гэтых-жа сходах былі створаны ўдарныя брыгады.

Надаўна рабочыя прапрацоўвалі прамову тав. Сталіна.

З поля грамадзкай работы «выпала» брыгада каменьшчыкаў Чьжізава.

Ні адзін будаўнік з гэтай брыгады не падпісаўся на пазыку «Трэці рашаючы».

Дом друку павінен быць скончан у тэрмін. Узьнімаючы грамадзкую работу, разгортваючы сацспаборніцтва і ўдарніцтва, мы павінны поўнасьцю скарыстаць летнія дні для ўдарнага будаўніцтва Дому друку.

Паліграфічная прамысловасьць Менску з нецярплівасьцю чакае скончэньня пабудовы будучага палацу друку.

Брыгада ЦКК-НК РСІ «Зьвязды» і «Рабочего»
МІНКОЎ, САРНАЎ.

Мэханізмы не нагружаны

Вярбоўка рабочых ідзе бясплянава

БЕЛБУДАБ'ЯДНАНЬНЕ. Пачало ў гэтым годзе будаўнічы сэзон са спазьненьнем—да самага пачатку работ не было вядома, якія пабудовы зьяўляюцца ўдарнымі, у якім парадку трэба праводзіць будаўніцтва.

Звычайна Белбудаб'яднаньне скары стоўвае зімовы час для падвозкі матар'ялаў на месца пабудоў, для падрыхтоўкі праектаў і чарцяжоў.

Але з прычыны адсутнасьці пераліку работ і цьвёрдага сьпісу аб'ектаў атрымалася, што ў пачатку Белбудаб'яднаньне трымала курс на праграму ў разьмеры 40 мільёнаў руб., пасьля—35 мільёнаў, а на 1 ліпеня праграма ўстаноўлена ў 27.480 тыс.

Дзяржплян БССР, сэктар капітальнага будаўніцтва БСНГБ дагэтуль на маюць цьвёрдае кантыгенту матар'ялаў. Яны іх разьмяркоўваюць па ступені ўдарнасьці і першачарговасьці пабудоў, а пароўні паміж усімі арганізацыямі пакрысе. З-за бясплянаваснасьці Белбудаб'яднаньне зімою зьвязае на адны пабудовы ўсю цэглу, на другія—камень, на трэція—вапну, і калі трэба было разгарнуць работу, дык ні на адной пабудове нельга было нармальна працаваць.

План будаўніцтва за першае паўгодзьдзе выкананы толькі на 56,3 проц.

Устаноўлена 45 ударных аб'ектаў, але, з прычыны недахвату матар'ялаў, будаўніцтва раду аб'ектаў не пачалося.

Паўтараюцца леташнія памылкі з чарцяжамі. Часта прыходзіцца перарабляць чарцяжы і пляны (праект фабрыкі-кухні, фабрыкі штучнага валакна і г. д.).

Белбудаб'яднаньне мае мэханічную базу, якая налічвае 26 бэтонамешалак, 10 гравіясартовак, 48 крантаў, 28 растворамяшалак, 3 транспартэры і г. д. Але гэтыя машыны з-за адсутнасьці матар'ялу не нагружаны поўнасьцю, а толькі на 60-70 проц.

Адчуваецца недахват рабочай сілы—у чэрвені патрэбна было 10.465 рабочых, працавала 5.460, або 52,2 проц. Тлумачыцца гэта тым, што набор праводзіўся неарганізаваным парадкам, пры наборы назіралася нездаровая канкурэнцыя паміж пасобнымі аб'яднаньнямі.

Цякучасьць рабочай сілы на пабудовах дасягае 35,3 проц.

Белбудаб'яднаньне ня выканала дырэктывы аб зьніжэньні сабекошту.

Лішняя трата грошай на вярбоўку рабсілы, падарожаньне транспарту, вялікія выдаткі на камандыроўкі для падштурхоўваньня перасоўкі грузаў, няпоўнае скарыстаньне мэханізмаў—прычыны невыкананьня дырэктыў.

Адсутнасьць чарцяжоў затрымлівае будаўніцтва

Баявая задача нашай брыгады—правесьці будаўніцтва на адным з буйнейшых прамысловых прадпрыемстваў Менску—заводзе «Камунар».

Завод «Камунар» расьце з кожным месяцам. Маленькія майстэрні ператварыліся ў буйное прадпрыемства.

Каля заводу, на т. зв. Кашарскім плошчы будуюцца новыя вялікія карпусы. З іх два карпусы ўжо пабудаваны. За апошні час пабудова аднаго корпусу некалькі затрымалася; пабудова другога працягваецца. У гэтым корпусе будуць разьмешчаны грамадзкія арганізацыі заводу і сталовая.

Затрыманьне ў пабудове першага корпусу выклікана зьнешнай яго назначэньня. З пачатку меркавалася ў гэтым корпусе наладзіць цэх малочнай пасуды, але потым гэтае рашэньне скасавалі, корпус будзе прыстасаваны для сьлясар-на-мэханічнага цэху. Адсутнасьць чарцяжоў затрымлівае пабудову. Зараз упагу трэба зьвярнуць на гэту частку будаўніцтва, на загатоўку чарцяжоў.

Будаўніцтва «Камунара» ў патрэбнай ступені забясьпечана будаўнічымі матар' яламі. Але не хапае рабочай сілы, у першую чаргу цесьляроў, іменна з-за гэтага тармозіцца работа. Калі зараз-жа на будаўніцтва ня будзе перажнута 10-12 цесьляроў, дык яно ў тэрмін ня будзе скончана.

Вярбоўка рабочых праводзіцца Менбудаб'яднаньнем, прычым апошняе часта займаецца перакідкай рабочых з адной пабудовы на другую. Гэта адбіваецца на тэмпах работы.

Рабочкому на пабудове няма. Рабочыя абслугоўваюцца групкомам № 3, але фактычна прафработа на пабудове не вядзецца.

Брыгада ЦКК-НК РСІ, «Зьвязды» і «Рабочего»: НЭЙМАН, ІОФФЭ, ГРЫНКО, ЮДЭЛЬЗОН.

Выязная брыгада „Зьвязды" ў саўгасе „Банонь"

ДАНА БАЯВАЯ ПУЦЕЎКА

СУСТРЭЧНЫ ПАЎГАСУ—14 ТАВАРНЫХ СЬВІНЕЙ АД КОЖНАЙ СЬВІНАМАТКІ—ВЫКАНАЦЬ ВА ШТО-Б ТАМ НІ СТАЛА

Гэта было 10-га ліпеня. Ва ўсіх выдворных вучастках і аддзяленьнях раборы-ўдарнікі, пасты «Зьвязды» і шмат выразкі правералі выкананьне ўзятых самаабавязацельстваў па ўдарным дадзіку ліквідацыі прарываў у сьвінагадоўлі. У клюбах, у цесных пакоях інтэрнатаў, уважаючы кожнае слова, раборы-ўдарнікі падводзілі вынікі самаправеркі для вымяшчэньня ў газэце. Удзельнікі агляду прымалі на сябе прак тычныя абавязацельствы. Таму фактычныя сходы рабкораў былі спадабаблівай вытворчай нарадай, дзе намячаліся шляхі далейшай ліквідацыі прарываў.

У нарадах дня дакладніка адным з важнейшых вузлавых мерапрыемстваў была пабудова сьвіных лятэраў. Вынесьці ў лятэры сьвіное стада значала нанесьці сьмяротны ўдар па шырокай хвалі ўсякіх хваробаў сярод сьвіней. Так паўстала ва ўсю велічыню неабходнасьць максымальнага ўшчыльненьня тэрміну будаўніцтва лятэраў.

Па ўсіх вучастках былі сходы будаўнікоў. На гэтых сходах будаўнікі прынялі пастанову аб пераходзе на 10-цігадзінны рабочы дзень. Парываючы са старымі традыцыямі, у нядзелю на Бяноньскім вытворчым вучастку вышлі на працу арцелі цесьляроў. З Полацку для кіраўніцтва работамі быў прыкамандыраваны старшы тэхнарук Скарупскі, які энэргічна ўзяўся за работу. Значная частка коняй была кінута на падвозку будаўнічых матар'ялаў.

І 23-га ліпеня на 4 дні раней тэрміну была поўнасьцю закончана пабудова лягеру ў Бяноньскім вытворчым вучастку. У 2 гадзіны дня рабочы, які павесіў чырвоны сьцяг—сыгнал, які абвяшчаў аб перамозе.

У гэты-ж дзень тэлефаграмы з аддзяленьняў данесьлі:

«...Лягеры ў Вусьці закончаны... У Нача-Шпакоўшчыне лягеры поўнасьцю абсталяваны»...

Адсталымі аказаліся «Вязьдедавічы», у якіх яшчэ 26-га ліпеня не былі накрыты саломай павеці. Вінаватай аказалася адміністрацыя вучастку і кіраўніцтва саўгасу, якая не адпусьціла саломы для работы.

Дакладнік—пачатак масавай сыстэматычнай работы па ліквідацыі прарываў у сьвінагадоўлі. Пастанова партыйнага камітэту і дзённых ячэек, прапановы ка місіі спецыялістаў, пастановы вытворчых нарад—вось пералік баявых дакумэнтаў, для правядзеньня якіх быў дадзены старт у часе ўдарнага дакладніка.

Куды ў большай частаце, чым раней, заходзяцца сьвінарнікі. Ля матачніка ў Бононі зроблены выгулы, двор, ачышчаны ад гною і трупаў парасят, жаўцее пяском. Ва ўсіх аддзяленьнях вядзецца распляноўнае выгулаў. Хворыя парасяты адсаджваюцца ад здаровых.

Правааапартуністычнай практыцы ў саўгасе нанесен руйнуючы ўдар. Партыйныя ячэйкі, прачынуўшыся ад трохмесячнага сну, пачынаюць браць тэмпы. Таму і ёсьць ужо ў цэхавых яячэйках заявы лепшых прэміяваных ударнікаў аб прыёме іх у партыю.

У барацьбе за тэмпы выраўноўваецца фронт уборачнай. 25-га ліпеня ў начашпакоўшчынскім аддзяленьні поўнасьцю закончана ўборка канюшыны і сенажацяй і ў іншых аддзяленьнях рапстуць тэмпы праполкі і ўборкі.

Найбольш ярка выяўленае правааапартуністычнае супраціўленьне ў правядзеньні дырэктыў партыі было на вучастку зьдзельшчыны. Цяпер з увядзеньнем зьдзельшчыны значна лепш. На зьдзельшчыну пераведзены сьвінарыкі, у тым ліку і старэйшыя, у некаторых аддзяленьнях пераведзены на зьдзельшчыну падвозчыкі вады і корму. Больш рэгулярна вывешваюцца ў сьвінарніках ведамасьці па зарплаце за кожны дзень зьдзельнай работы. Увядзеньне зьдзельшчыны дапамагло ўзмацненьню расхістанай раней дысцыпліны.

Правядзеньне вэтэрынарных і зоатэхнічных мерапрыемстваў ужо дае сябе адчуваць: паніжэўся адыход парасят з 48 проц. на 20-га чэрвеня да 38,4 проц. на 20-га ліпеня.

***

Другі зьлёт ударнікаў усіх цэхаў і аддзяленьняў праходзіў пад знакам мабілізацыі ўсіх сіл саўгасу на далейшую ліквідацыю прарываў у галіне сьвінагадоўлі.

Зьлёт падваў вынікі ўдарнага дакладніка. Ударнікі кожнага цэху і аддзяленьня ўзялі на сябе рад самаабавязацельстваў:

«УДАРНІКІ СЬВІНАГАДОЎЧЫХ ЦЭХАЎ даюць абяцаньне поўнасьцю захоўваць усё неабходныя зоатэхнічныя і вэтэрынарныя мерапрыемствы і чыстату ў сьвінарніках і ўважлівы догляд—максымальна зьнізіць адыход парасят.

УДАРНІКІ ТРАКТАРНАЙ КАЛЁНЫ абавязваюцца ў вызначаны тэрмін скончыць ворыва пад зімыя і падняцьце на зяблева, поўнасьцю выканаўшы ўсе вытворчыя заданьні, максымальна зьнізіўшы прастоі, дабіўшыся рацыянальнага скарыстаньня гаручага. Ударнікі паляводчых цэхаў даюць абяцаньне ЦК КП(б)Б і «Зьвязьдзе» па-ўдарнаму правесьці ўборку, стварыўшы кармовую базу для сьвіней». (З тэлеграмы зьлёту—ЦК КП(б)Б і рэдакцыі «Зьвязды»).

Падводзячы вынікі працы выязной брыгады «Зьвязды», намячаючы далейшыя задачы, партком заклікаў увесь рабочы калектыў на выкананьне баявой праграмы ўдарнікаў саўгасу ў барацьбе за сацыялістычную сьвінагадоўлю.

Рабочы калектыў саўгасу на чале з партыйным калектывам, ударнікамі пачынае ўпарты штурм ліквідацыі прарываў. Работы яшчэ непачатыя горы. Трэба дабіць канчаткова правааапартуністычную практыку, разгарнуць сапраўдныя бальшавіцкія тэмпы ў барацьбе за 14 таварных сьвіней—сустрэчны плян саўгасу. На зьлёце прынят рад канкрэтных абавязацельстваў.

У часе старту—ударнага дакладнікадата баявая пуцёўка на поўны ход. Дайсьці да фінішу—гэта значыць сыстэматычна перавыконваць бальшавіцкія заданьні па сацыялістычнай сьвінагадоўлі.

Брыгада «ЗЬВЯЗДЫ».

Тэмпы жніва перанесьці на сенаўборку

МАЗЫР. Калгас «Камінтэрн», Савіцкага сельсавету, своячасова падрыхтаваўся да ўборкі ўраджаю. У калгасе складзены рабочыя планы, кожнаму калгасьніку і калгасьніцы выданы працоўныя кніжкі. Брыгады паміж сабою заключылі сацдагавары на лепшае правядзеньне ўборкі. У калгасе арганізаваны ясьлі і дапічная пляцоўка. Заканчваецца будаўніцтва сіласнай вежы, у якой будзе засіласавана 300 тон сілясу.

Дзякуючы правільнай расстаноўцы сіл і арганізацыі работы, пляны ўборкі збожжа выкананы датэрмінова. Замест 2 жніўня ўборка збожжа закончана 25 ліпеня.

Аднак, ёсьць і вялізарны недахоп—з 503 гэкт. сенажаці на 24 ліпеня скошана толькі 263 гэкт. Гэты прарыў павінен быць неадкладна ліквідаваны на аснове практыкі ўдарнай уборкі жыта.

Лісоўскі.

„Ні аднаго цэнтнэра збожжа прыватніку"

СКЛАДЫ НЕ І АТОВЫ

да сустрэчы збожжа

У ПЯТНАЦЦАЦІДЗЕНЬНІК АГЛЯДУ ПРЫВЕСЬЦІ УСЕ ЗЬВЕНЬНІ ЗАГАТОЎЧАГА АПАРАТУ У ПОЎНУЮ БАЯВУЮ ГАТОЎНАСЬЦЬ

Сухія цыркуляры замест жывога кіраўніцтва

Брыгада Наркамснабу БССР правяла праверку падрыхтаванасьці да збожжазагатоўчай кампаніі па Саюзхлебе, Белхлебжывёлсаюзе і Белкаапсаюзе. Выявілася, што збожжазагатоўчыя арганізацыі не падрыхтаваліся належным чынам да кампаніі.

САЮЗХЛЕБ да гэтага часу не распрацаваў пытаньне аб бясстарнай перавозцы збожжа. Мясцом даны толькі агульныя дырэктывы, але канкрэтна, як арганізаваць гэту спрасу па мясцох, ня ведаюць.

Склады не падрыхтаваны да прыёмкі збожжа. Дазынфэкцыя складаў праходзіць недапушчальна марудна, пакуль што прадэзынфэктавана толькі 40 проц. складу.

Па 15 пунктах Саюзхлеба рамонт складаў яшчэ ня скончаны, а па асобных пунктах (Жлобін і інш.) яшчэ нават не распачаты.

Пытаньні аб мэханізацыі складаў не распрацаваны яшчэ належным чынам. Да гэтага часу устаноўлен толькі адзін транспартэр на менскім цэнтральным складзе.

Веткі чыгуначнай лініі да складаў яшчэ не пракладзены з-за адсутнасьці матар'ялаў. Паводле пастановы СПА СССР веткі павінны быць пракладзены непасрэдна чыгункай, але апошняя гэтай пастановы ня выконвае.

У Бабруйску, Гомелі, Магілеве і Віцебску не хапае складаў для збожжа. Да адшукваньня новых складаў не прыступілі. У Менску частку складаў перадалі ўстановам на часовае карыстаньне, але ўстановы своячасова не вызваляюць памяшканьняў і вядуць з Саюзхлебам вед

Год выданьня—XV
№ 205 (4110)
ПЯТНІЦА 31, ЛІПЕНЯ 1931
Цана нумара 5 кап.
выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

Зьвязда

Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА
МЕНСК, САВЕЦКАЯ, 63.
Тэлефоны:
рэдактар—4-27,)—сакратар—10-74, партсэктар—13-80, прамысл.—13-60, сяв. эканм.—6-19, мясц. інфарм.—6-19, замеж. інфарм.—6-19, начны рэдактар—6-42, міжгародняй інфармацыі—10-74, канторавыд-ва—7-81, адз. абанемент—7-31

НАПЯРЭДАДНІ 1-га ЖНІЎНЯ ЗА МЯЖОЮ

„Мы крывёю свайго сэрца будзем абараняць СССР"

Баявая падрыхтоўка пралетарыяту

Рэвалюцыйная інтэлігенцыя выступае супроць вайны з Савецкім Саюзам

БЭРЛІН, 28 ліпеня. Група пісьменнікоў выступіла з заявай супроць вайны. **Вільні Брэйбэль** піша з турмы: **«Мы, рэвалюцыйныя рабочыя, будзем крывёю свайго сэрца абараняць расійскую рэвалюцыю.** Дзе-б мы ня былі, мы, як салдаты рэвалюцыі і сацыялізму, будзем з усёй адданасьцю бараніць спадчыну вялікага правадыра Леніна і выконваць свой бальшавіцкі абавязак».

Буржуазны пісьменьнік **Стэфан Цвэйг** піша: **«Той, хто сёньня высоўвае ідэю вайны супроць Савецкага Саюзу, зьяўляецца здраднікам народу** ня толькі свайго, але і ўсяго працоўнага чалавецтва, якое па-творчаму будуе сваё будучае».

«Ні адзін клясава сьвядомы пралетар ў сьвеце,—піша **Марыя-Оскар-Граф,**—ні адзін сумленны інтэлігент ня можа сёньня адсутнічаць на фронце барацьбы за новы правільны парадак міру, які зараз ажыцьцяўляецца ў Савецкім Саюзе».

Амэрыканскі пісьменьнік **Тэадор Дрэйзэр** заяўляе: «Я рашучы праціўнік падрыхтоўкі вайны любой краінай, якая накіравана да зьнішчэньня Саветаў, ці да вайны супроць іх».

«Кожны рэвалюцыянэр, кожны чалавек, які хоча сьвядомага будаўніцтва чалавечага грамадзтва, павінен актыўна змагацца супроць пагражаючай вайны», —заяўляе **Эрнэст Толер.**

Горача заклікаючы супроць вайны, **Андор Габор** указвае, што калі вайна адмяраючага капіталізму супроць узрастаючага сацыялізму заўтра выбухне, дык гэта ўжо ні для кога ня будзе нечаканасьцю (ТАСС).

Нямецкі пралетарыят стварае антываенныя камітэты

БЭРЛІН, 28 ліпеня. У **Бітэрфэльдзе**—цэнтры сярэднянямецкай хэмічнай прамысловасьці—учора адбылася антываенная канфэрэнцыя прадстаўнікоў прадпрыемстваў гэтага раёну. Канфэрэнцыя выбрала **антываенны камітэт** з прадстаўнікоў буйнейшых заводаў і пастанавіла паслаць аднаго рабочага вядомых хэмічных заводаў Лейна ў Парыж **для ўдзелу ў дэманстрацыях французскіх рабочых у дзень 1 жніўня** (міжнародны чырвоны антываенны дзень). (ТАСС).

Чырвоныя сьцягі на вуліцах Вільні

ВІЛЬНЯ, 29. Рабочая кляса пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі **энэргічна праводзіць падрыхтоўчую работу да выступленьняў ў дзень 1 жніўня.** У сувязі з гэтым на ногі пастаўлена ўся віленская ахранка і паліцыя. **Па першай падазронасьці робяцца вобыскі і масавыя арышты.**

27 ліпеня, як паведамляе фашысцкі **«Кур'ер Віленскі»,** паліцыя **арыштавала 2 рабочых,** якія рыхтаваліся вывесіць чырвоны сьцяг на рэпрэзэнтацыйным палацы.

Упочы з 27 на 28 ліпеня на тэлеграфных правадох на вуліцы Шэптыцкага быў **выкінут чырвоны сьцяг** з камуністычным лёзунгам. Прыбыўшая паліцыя зьняла яго і арыштавала аднаго чалавека.

Масавыя арышты перад 1 жніўня

ВАРШАВА, 28 ліпеня. У сувязі з набліжэньнем 1 жніўня на Польшчы ідуць **масавыя арышты.** За адзін учарашні дзень ва **Львове арыштавана звыш 60 чалавек,** якія падазраюцца ў камуністычнай дзейнасьці. Ва многіх рабочых цэнтрах паліцыя робіць павальныя аблавы. (ТАСС).

Польшча на поўным ходзе да гаспадарчага развалу

ВІЛЬНЯ, 29. Тэмпы разьвіцьця эканамічнага крызісу ў фашысцкай Польшчы прымаюць **надзвычай шпаркі характар.** Сямімільнымі крокамі краіна ідзе да гаспадарчай катастрофы. Яркім паказальнікам гэтага зьяўляюцца **шматлікія банкруцтвы розных прамысловых і гандлёвых фірмаў.**

У Варшаве на працягу мінулага кварталу **збанкрутавала звыш 150 прамысловых фірм і працэс іх ліквідацыі ўзмацняецца з кожным днём.**

У Заходняй Беларусі, дзе **поўнаўладна пануе акупанцкі бізун і сыстэма няпрыкрытага калёніяльнага грабежніцтва, сымптомы гаспадарчага ўпадку выяўляюцца яшчэ вастрэй, яшчэ больш паказальна.** Фашысцкі **«Дзеньнік Віленскі»** за 29 ліпеня падае надзвычай характэрныя даныя аб банкрутствах розных прадпрыемстваў па абшары Віленскага ваяводзтва, уключаючы і Вільню, што адбыліся за апошнія два кварталы.

Ліквідавана: **48 харчовых прадпрыемстваў, 98 харчовых крам, 17 пякарэнь, 11 бойняў, 37 мясных крам, 8 заводаў па вырабе мінэральных вод, 2 фабрыкі цукерак, 7 хэмічных прадпрыемстваў, 19 мэталёвых, 14 прадпрыемстваў па выпрацоўцы вопраткі, 14 гарбарань, 2 папяровыя фабрыкі, 4 дрэвапрацоўчыя фабрыкі і 2 паліграфічныя прадпрыемствы.**

Эканамічны крызіс **асабліва руйнуюча ўдарыў па саматужніках.** На працягу тэтых самых двух кварталаў збанкрутавала: **65 сталярных майстэрань, 44 сьпесарныя, 17 кавальскіх, 76 шавецкіх, 25 кравецкіх і звыш 100 майстэрань з іншых галін саматужніцтва.**

«Дзеньнік Віленскі» дадае, што, з прычыны **бесьперапынна** ўзрастаючай **галечы, агульнага застою і вострага беспрацоўя, назіраецца вялікае ажыўленьне** ў лембардах. Зьбяднелая дробная буржуазія, рабочыя і беспрацоўныя масамі прастойваюць перад лёмбардамі і збываюць за бесцань апошнія здабыткі: вопратку, абутак, бялізну і г. д. Усе лёмбардныя склады **настолькі перапоўнены,** што прыняцьце закладаў **спынена.**

У выніку галечы і голаду Вільня **літаральна наводнена жабракамі,** з якімі фашысцкая ўлада ня ведае, што рабіць.

Такімі самымі тэмпамі **замірае і культурнае жыцьцё краіны.** Так, у Вільні фашысцкая ўлада, з прычыны катастрафічнага фінансавага становішча, **спыніла будаўніцтва народных школ.**

Характарызуючы сучасную невясёлую рэчаіснасьць фашысцкай Польшчы, сацыял-фашысцкі «Роботнік» з чыста цынічным гумарам піша: «крызіс увайшоў у вельмі вострую стадыю і ахапіў усе галіны жыцьця».

«Ажыўленьне панае толькі ў канцылярыях каморнікаў, у шпіталях, у «цыркуе», на Дзікай вуліцы (турма) і ў пахавальных бюро».

Камэнтараў ня трэба!

Няпрыкрытае акупанцкае грабежніцтва

ВІЛЬНЯ, 29. Фашысцкі «Дзеньнік Віленскі» падае вельмі характэрны факт, які кідае сьвятло на той калёніяльны ўціск і адкрытае грабежніцтва, якое пануе ў Заходняй Беларусі.

У вёску Бараўцы, Калявіцкай гміны, Вілейскага павету, у 12 гадзін ночы да селяніна Б. Ількевіча прышоў сэквэстратар у суправаджэньні паліцыянта, пабудзіў гаспадароў, сам, як сапраўдны «крэсавы» гаспадар, запаліў лямпу і зажадаў выплаты 10 злотых падатку і судовых мытаў. З прычыны надзвычайнай беднасьці селянін ня мог задаволіць патрабаваньня сэквэстратара, тады апошні **сякерай выпамаў дзьверы ў хляве і забраў апошнюю карову.** Падобныя факты здараюцца ў Заходняй Беларусі тысячамі.

Рэальная пагроза фінансавага краху ў Англіі

ПАРЫЖ, 27 ліпеня. Французская ўрадавая газэта **«Тан»** паказвае, што абвастрэньне фінансавага крызісу ў Нямеччыне **выклікала сур'ёзныя фінансавыя затрудненьні ў Англіі і пагражае крахам грашовай сыстэмы ўсяго капіталістычнага сьвету.** Газэта патрабуе, каб Англіі была тэрмінова аказана фінансавая дапамога.

— **«Неабходна,**—піша газэта,—**каб усе дзяржавы** (капіталістычныя) **арганізавалі сумесную абарону супроць ліпучай хваробы, якая з выключнай шпаркасьцю пашыраецца з Нямеччыны і якая пагражае ўсёй сусьветнай гаспадарцы».**

* * *

Заява французкай газэты набывае асаблівы інтарэс, калі ўлічыць, што фінансавыя затрудненьні Англіі тлумачацца **ня толькі ўплывам нямецкай фінансавай катастрофы, але таксама і сьвядомай палітыкай Францыі, якая наўмысьля выграбае золата з англійскіх банкаў.** Разумеецца, золата выграбаецца іменна для таго, каб, паставіўшы Англію ў цяжкае становішча, потым **прапанаваць ёй дапамогу на ўмовах, выгодных для Францыі.** Бясспрэчна, іменна такога роду дапамогу і мае на мэце французкая ўрадавая газэта.

„Малыгін" сустрэўся з цэпэлінам

ЛЕНІНГРАД, 28 ліпеня. У Ленінградзе сёньня атрымана наступная радыёграма з ледаколу **«Малыгін»:** «28 ліпеня ў 9 гадз. 30 мін. вечара дырыжабль бліскучых перашкод зрабіў пасадку побач з **«Малыгіным»** у бухце **Ціхая.** Адбыўся хуткі абмен поштай, пасьля чаго цэпэлін накіраваўся далей.

Бухта Ціхая знаходзіцца каля вострава **Гукера на Зямлі Франца Іосіфа.** На гэтым востраве ёсьць мэтэаралёгічная станцыя Арктычнага інстытуту. На востраве жывуць 11 зімоўшчыкаў з начальнікам станцыі тав. **Івановым».**

Неадкладна рэалізаваць

ПАСТАНОВЫ НАРАДЫ ПРЫ НКПБ

аб арганізаваным наборы рабочай сілы

Нарада органаў працы, прафсаюзаў і гаспадарчых органаў, якая адбылася пры Наркампрацы, вызначыла асноўныя мерапрыемствы ў перабудове работы па вярбоўцы і падрыхтоўцы рабочае сілы. Цэнтр увагі работы па забесьпячэньні прамысловасьці патрэбнай рабочай сілай павінен быць перанесены на **арганізаваны набор з калгасаў шляхам заключэньня дагавораў з калгасамі і калгасьнікамі,** шляхам выкананьня пастановы ўраду аб адносінах **як у сацыялістычным сэктары сельскай гаспадаркі, так і ў індывідуальным.** Нізавыя зьвяньні органаў працы і гаспадарчыя арганізацыі павінны забясьпечыць ня толькі выкананьне плянаў набору рабочае сілы, але таксама і арганізаваную падрыхтоўку новых кадраў рабочых.

Вялікае значэньне набывае задача ўкаранёньня жаночае працы ў прамысловасьць. У даным выпадку паляпшэньне сацыяльна-бытавых умоў для працы жанчын мае рашаючую ролю.

Канкрэтнае кіраўніцтва і плянаванае разьвіцьцё сацыялістычных форм працы, сацыялістычная рацыяналізацыя, правільнае разьмеркаваньне работы і правільнае скарыстаньне кваліфікаванай рабочай сілы, барацьба за поўнае выкарыстаньне мэханізмаў, за разгорнутую мэханізацыю вытворчасьці, за ліквідацыю абязьлічкі зьяўляюцца важнейшай умовай зьмякчэньня недахвату рабочай сілы.

Нарада ўхваліла перабудову **тарыфнай сыстэмы пад кутом зьнішчэньня ўраўніпаўкі, максымальна пашыраючы зьдзельна - прэміяльную аплату працы.** У мэтах замацаваньня рабочых на вытворчасьці нарада катэгарычна выказалася за неабходнасьць карэннага паляпшэньня культурна-бытавога абслугоўваньня рабочых. Павінна быць палепшана работа каапэрацыі і сталовак, шырэй разгорнута сетка ясьляй, дзіцячых дамоў, пляцовак і г. д., палепшана мэдыка-санітарнае абслугоўваньне і санітарна-тэхнічныя ўмовы працы на прадпрыемствах.

У адпаведнасьці з новымі задачамі павінна быць перабудавана і работа ўсіх навукова-дасьледчых устаноў па тых галінах, якія пералічаны вышэй. У прыватнасьці павінна быць перабудавана работа інстытуту аздараўленьня і арганізацыі працы пры Наркампрацы БССР.

Пасьпяховае выкананьне задач у галіне працы будзе ажыцьцёўлена, калі будзе забясьпечана плянаванае кіраўніцтва ва ўсіх зьвяньнях сацыялістычнай вытворчасьці, пачынаючы ад прадпрыемства і раённага інспэктара працы і канчаючы адпаведнымі цэнтральнымі органамі. Вось чаму ўзмацненьне плянаваэканамічных органаў кваліфікаваным складам працаўнікоў зьяўляецца важнейшай задачай.

Нарада адзначыла зусім недапушчальныя адносіны з боку **Белкаапсаюзу, Белсельпрому, Саюзхлеба, Паліграфаб'яднаньня, Белпаперы, ЦП саюзаў лесдрэў рабочых, швэйнікаў, папернікаў, рабочых сланцовай і тарфяной прамысловасьці, працаўнікоў каапэрацыі і гандлю,** якія не прынялі ўдзелу ў расправе працоўцы практычных мерапрыемстваў па арганізацыі працы паводле апошняй прамовы тав. Сталіна.

Нарада вызначыла канкрэтныя шляхі перабудовы работы ў галіне арганізацыі працы, вярбоўкі, падрыхтоўкі і замацаваньня рабочай сілы. Пасьпяховасьць рэалізацыі гэтых пастаноў будзе залежаць ад таго, наколькі ўсе мясцовыя органы працы, прафсаюзы і гаспадарнікі зразумеюць важнасьць гэтага пытаньня і даны пэрыяд, наколькі мясцовыя партыйныя арганізацыі стануць на чале гэтай важнейшай справы.

Рашучай барацьбой з правым апартунізмам і «левымі» загібамі, з кулацкімі перашкодамі вярбоўцы перадавых калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас вёскі ў прамысловасьць—даб'ёмся арганізаванага забесьпячэньня рабочай сілай сацыялістычных прадпрыемстваў. Адначасова трэба пільна сачыць, каб у рады завербаваных ня трапіў кулацкі элемэнт, каб **на нашы прадпрыемствы ішлі перадавыя ўдарнікі сацыялістычнай вёскі.**

Пабудова падводнай лодкі „Ваяўнічы Бязбожнік"

Цэнтральны савет ваяўнічых бязбожнікаў БССР пачаў збор сродкаў на пабудову лодкі «Ваяўнічы бязбожнік». На лодку трэба сабрать 100.000 руб. 1-га жніўня будзе праведзен аднадзенны скарбоначны збор.

Па сьлядох аглядаў Зьвязды

24 мая ў аглядзе друку **«ПАМЫЛКІ І МАЎЧАНЬНЕ Ў ВАЖНЕЙШЫМ ПЫТАНЬНІ»** «Зьвязда» пісала:

«Калгасьнік Беларусі»—цэнтральная калгасная газэта БССР. Зусім відавочна, што яна першай павінна была разгарнуць баявую масавую кампанію вакол новага закону аб с.-г. падатку, азнаёміць з ім кожнага калгасьніка і аднаасобніка. Ці зрабіла гэта газэта? Прагляд камплектаў «Калгасьніка Беларусі» за красавік і першую палову мая гаворыць не на карысьць рэдакцыі.

Мала таго, што «Калгасьнік Беларусі» за гэты час амаль зусім не даваў разгорнутых матар'ялаў, якія-б папулярызавалі новы закон аб с.-г. падатку. У тых адзіночных артыкулах па гэтым пытаньні, якія зьмясьціла газэта на сваіх старонках, рэдакцыя дапусьціла шмат няправільных і палітычна шкодных установак. Іншымі словамі, газэта ня толькі зусім невыстарчальна растлумачыла новы закон аб с.-г. падатку, але і дапусьціла пры гэтым грубыя палітычныя памылкі.

Рэдакцыя «Калгасьніка Беларусі» ўспамінае аб новым законе пра с.-г. падатак толькі ад выпадку да выпадку. Мы прагледзелі ў храналёгічным парадку нумары «К. Б.» ад 1 красавіка да 16 мая, за выключэньнем № № 45, 55 і 57. За ўвесь гэты час рэдакцыя зьмясьціла толькі адзін артыкул Наркамфіну. Больш ні аднаго радка. Нельга не падкрэсьліць, што цэлы рад артыкулаў газэты аб калектывізацыі, пасеўнай кампаніі і г. д. зусім ня зьвязан з новым законам аб с.-г. падатку. Рэдакцыя забыла, што папулярызацыю новага закону трэба ў першую чаргу падпарадкаваць задачам барацьбы за посьлех веснавой сяўбы і тэмпы калгаснага прыліву».

Рэдакцыя газэты «Калгасьнік Беларусі» поўнасьцю згадзілася з гэтай ацэнкай і зьмясьціла рэдакцыйны артыкул аб аглядзе друку «Памылкі і маўчаньне ў важнейшым пытаньні»:

«У газэце «Зьвязда» № 137 ад 24 мая зьмешчан агляд друку «Памылкі і маўчаньне ў важнейшым пытаньні». У аглядзе зусім правільна паказана, што наша газэта «амаль зусім не давала разгорнутых матар'ялаў, якія-б папулярызавалі новы закон аб с.-г. падатку».

«Зьвязда» дала разгорнутую крытыку артыкулу, зьмешчанага ў газэце «Калгасьнік Беларусі» ад 6 красавіка, мэтай якога было растлумачыць калгасным і аднаасобным бядняцка-сераднякам масам новы закон аб сельгаспадатку. У гэтым артыкуле пісалася:

«Мы зараз маем у калгасах СССР 10 мільёнаў, а ў калгасах БССР—звыш 60 тысяч бядняцка-сераднякоў гаспадарак. Выходзячы з гэтага новы закон аб сельгаспадатку прадугледжвае абкладаньне падаткам калектыўных гаспадарак, неаграмаджаных даходаў калгасьнікаў і аб кладаньне аднаасобнікаў».

Такая памылковая блытаная ўстаноўка дае падставу пічыць, быццам-бы ад таго ці іншага процанту калектывізацыі залежыць тая ці інш. сыстэма абкладаньня. Гэта ня правільна. Правільна тое, што буйны рост калектывізацыі, уваход у калгасы больш 10 млн. бядняцка-сераднякіх гаспадарак СССР патрабуе пабудовы асобнай сыстэмы абкладаньня аграмаджанага сэктару, а таксама калгасьнікаў па іх неаграмаджанай частцы маемасьці. Таму новы закон аб сельгаспадатку складаецца фактычна з трох частак: абкладаньне калгасаў, калгасьнікаў і аднаасобнікаў.

У гэтым-жа артыкуле пісалася, што «ў аднаасобных гаспадарках, асабліва заможна-кулацкіх, разьмер падатку прагрэсыўна ўзрастае разам з ростам даходаў і дасягае ад 4 да 30 кап. з кожнага рубля даходу, а па кулацкіх—ад 20 да 70 кап. з рубля».

Сэпраўды-ж у новым законе аб сельгаспадатку выразна паказана, што ад 4 да 30 кап. абкладаюцца сераднякіх гаспадаркі, а ад 20 да 70 кап. кулацкія, не гаворачы ўжо аб тым, што фармулёўка артыкулу ў «К. Б.» дае падставу падзяляць кулацкія гаспадаркі на проста кулацкія і «заможна-кулацкія».

У тым месцы, дзе гутарка ідзе аб абкладаньні даходаў ад продажу сельска-гаспадарчых прадуктаў на прыватным рынку, «Калгасьнік Беларусі» нічога не сказаў аб тым, што новы закон аб сельска-гаспадарчым падатку забараняе абкладаць даходы ад продажу па рынкавых цэнах прадуктаў тых гаспадарак, якія выканалі дагавары па кантрактацыі і заданьні па загатоўках.

Рэдакцыя «Калгасьніка Беларусі» прызнае дапушчаныя ёю ў артыкуле памылкі. У далейшым газэта разгорне пастаяннае асьвятленьне на сваіх старонках пытаньняў, зьвязаных з сельска-гаспадарчым падаткам, выпраўляючы дапушчаныя памылкі».

Дзіўна, аднак, што гэты рэдакцыйны артыкул быў зьмешчан у газэце «Калгасьнік Беларусі» з недапушчальным СПАЗЬНЕНЬНЕМ (амаль праз тры тыдні пасьля агляду «К. Б.», зьмешчанага ў «Зьвязьдзе»).

* * *

«Раённая лепельская газэта «Калгасная праўда» да красавіка ўпарта абыходзіла маўчаньнем пытаньні зьдзельшчыны. «Калгасная праўда» не растлумачыла сутнасьці пераходу на зьдзельшчыну, не растлумачыла сутнасьці працадня. Газэта не паказвала прыкладу перадавых калгасаў, не навучала адстаючых. «Калгасная праўда» прагледзела клясавую барацьбу, якая адбываецца вакол уваядзеньня зьдзельшчыны».

Так ацэньвала «Зьвязда» 17 мая ў аглядзе друку ролю лепельскай раённай газэты «Калгасная праўда» ў барацьбе за зьдзельшчыну.

«Калгасная праўда» поўнасьцю перадрукавала агляд «Зьвязды» і апублікавала пастанову (хаця і з некаторым спазьненьнем) бюро раённага камітэту партыі па гэтым пытаньні.

Бюро РК КП(б)Б канстатавала, што «Зьвязда» зусім правільна паказала на палітычныя памылкі, дапушчаныя рэдакцыяй «Калгаснай праўды» ў барацьбе за зьдзельшчыну. Бюро РК, поўнасьцю згадзіўшыся з аглядам «Зьвязды», прапанавала рэдакцыі «Калгаснай праўды»

«... у сваёй рабоце па мабілізацыі партыйнай арганізацыі і працоўных мас на пасьпяховае завяршэньне другой бальшавіцкай сяўбы, на выкананьне і перавыкананьне вызначаных плянаў сяўбы, асабліва тэхнічных культурах, і ажыцьцяленьне пастановы бюро РК аб пектывізацыі ў часе веснавой кампаніі ня менш 75 проц. няцка-сераднякіх гаспадарак, гарнуць шырокую кампанію па мацаваньні калгасаў, зьвярнуць асаблівую увагу на ўвядзеньне зьдзельшчыны і ацэнку работы працаднёх.

... перабудаваць сваю работу кіраўніцтва і сувязі з рабсельмі, арганізуючы рэйды па асобных пытаньнях і галінах работы і с рыўшы пры калгасах пасты «гаснай праўды»...

Агляд «Зьвязды» і пастанова бюро КП(б)Б відавочна ўзьдзейнічаў на дакцыю «Калгаснай праўды». Газэта пачала, праўда, яшчэ далёка ня больш чальна, больш глыбока і сыстэматычна асьвятляць пытаньні зьдзельшчыны калгасах. «Калгасная праўда» па-ранейшаму адгукнулася на ўсесаюзны нарыс нік улику працы ў калгасах, абвешчаны ЦО—«Правдой».

Зьмясьціўшы перадавы артыкул пяцідзесьцігоддзю (27 чэрвеня), рэдакцыя кінула балявы мабілізуючы лёзунг:

«На заклік «Правды» адказаць мабілізацыяй нізавога друку і селькораў на ўдарнае правядзеньне пяцідзесьцігоддзя ўліку працы ў калгасах.

Пяцідзесьцігоддзе ўліку працы ў калгасах зрабіць балявымі днямі работы па сапраўдным укараненьні зьдзельшчыны ў калгасах, якая з'яўляецца пасьпяховае пераўборачнай кампаніі».

Падкрэсьліваем, што гэта толькі чатак пералому. «Калгасная праўда» павінна з яшчэ большай энэргіяй разгорнуць сапраўдную барацьбу за зьдзельшчыну, да канца выпраўляць свае памылкі, паказаныя ў аглядзе «Зьвязды».

На Усебеларускім зьезьдзе сампрамкаапэрацыі

Супроць ігнараваньня сампрамкаапэрацыі

У другі дзень работы зьезд заслухаў справаздачу ўсесаюзнага камітэту Сампрамкамітэту. Даклад зрабіў нам. старшыні тав. **Калыгін.** Дакладчык падкрэсьліў тыя вялізарныя задачы, якія стаяць перад прамкаапэрацыяй у трэцім рашаючым годзе.

— У нашай сыстэме,—кажа тав. Калыгін, — ёсьць паасобныя працаўнікі, якія лічаць, што прамкаапэрацыя ў другой пяцігодцы будзе згортвацца. Гэта вялікая памылка. Калі ў першым годзе **першай** пяцігодкі мы мелі прадукцыі на ж500 млн. руб., дык у першым годзе **другой** пяцігодкі намячаецца прадукцыі на 13 млрд. руб.

Аднак, тэмпы росту прамкаапэрацыі не адпавядаюць яшчэ патрабаваньням рабочай клясы. Яшчэ слаба разгортваецца работа па падшуканьні промыслаў, на недэфіцытным сырцы. Да гэтага часу слаба аварачалася ўвага на ложак.

Тав. Калыгін прыводзіць ряд ф ігнараваньня некаторымі савецкімі новамі сыстэмы прамкаапэрацыі.

Трэба весьці барацьбу з тымі, хто лаацэньвае і ігнаруе прамкаапэрацыю.

Па дакладу выказалася 20 чал.

Зьезд вітала брыгада бабруйскіх культурнікаў і прадстаўнік **ратам тарфяной арцелі.** Апошні рапарт зьезду, што вытворчая праграма на фе выканана імі да зьезду на 117 п

Барысаўская дэлегацыя, пад зьезду падарунак—вырабы сваіх чарных арцеляй, якія працуюць на дэфіцытным мясцовым сырцы.

Учора зьезд заслухаў справа праўленьня і рэвізыйнай камісіі Цэнтрпрамсаюзу. На зьезьдзе выпуска спэцыяльная газэта «Голас зьезду».

КАТЛЯР

Выноходка д-ра Лапідуса

дае магчымасьць з'эканоміць на мільёны пераўязачных матар'ялаў

У маі г. г. у «Зьвязьдзе» (№119) была надрукавана заметка аб выпаходзьце доктара менскага вайсковага шпіталю **Лапідуса.** Выпаходзьтва дае магчымасьць з'эканоміць тысячы мэтраў дэфіцытнай марлі і ваты. Дзякуючы спосабу перапрацоўкі марлі і ваты, знойдзенаму доктарам Лапідусам, удалося ў сакавіку г. г. пры роўнай колькасьці апэрацый выдаць на 80 мэтраў марлі менш, чым у лютым.

Брыгада «Зьвязды» азнаёмілася з вопытам доктара Лапідуса. Спосаб ачысткі марлі і ваты, якая была ва ўжываньні, прапанаваны доктарам Лапідусам, вельмі просты і можа быць выкарыстан у любой лекава-санітарнай установе. Пераўязачны матар'ял, забруджаны крывёю і гноем, кладзецца ў раствор 1-2 проц. гіпасульфіту, перамешваецца там, потым прамываецца халоднай вадой. Прамыты матар'ял зноў апускаецца ў поўпроцантны раствор нашатырнага сьпірту. Праз суткі яго вымаюць і прапалоскваюць халоднай вадой і высушваюць. Пасьля такой апрацоўкі пераўязачны матар'ял нічым не адрозьніваецца ні па знадворным выглядзе ні па іграсканічнасьці ад новага матар'ялу. Пры такой апрацоўцы адзін і той-жа матар'ял можа быць выкарыстан дзесяткі раз. З таго часу, як у шпіталі пачалі ўжываць саб доктара Лапідуса, не прыпа адзін кавалак марлі і ваты.

Брыгада «Зьвязды» пабывала у савецкай больніцы і пераканалася ў што там шмат марлі і ваты прап што ніякай эканоміі ў пераўязачны тар'яле няма. Між тым, вопыт д Лапідуса мог-бы даць у больніцы мі каштоўныя рэзультаты.

У заключэньне мы хацелі-б на міць ад выніках праверкі вынахо цэнтральным праўленьнем саюзу здрава БССР. Паводле прапаноў доктар Лапідус, разам з фарма работнікам 1-ай больніцы **Бацьк** рабіў вопыты хэмічнай апрацоўкі рой ваты. Вопыты далі бліскучы кі. Старая, забруджаная крывёю і вата пасьля адпаведнай апрацоўк сім не адрозьніваецца ад новай, я была ва ўжываньні. Апрацаваны м яя быў пераданы ў мікро-біял інстытут для дасьледаў, якія дал мі ўдалыя вынікі.

Брыгада «Зьвязды»: Г. Мро

П. Грынько і Карпу

Адказны рэдактар
С. БУДЗІН

СЁНЬНЯ, 31-га ліпеня, у 4 гадзіны дня ў памяшканьні малой залі ЦК КП(б)Б
АДКРЫВАЕЦЦА
ЎСЕБЕЛАРУСКАЯ НАРАДА
рэдактароў раённых газэт ільнаканапляводчых раёнаў з удзелам прадстаўнікоў цэнтральных устаноў і арганізацый (Калгасцэнтру, Наркамзему, Белільнаканаплябуду, Белільнаапрацоўкі, Ільнаканаплятрэсту, Белільнасьнабу, Белкаапсаюзу, Белсельснабу, Наркамснабу, Ільнаканаплянабядняньня і г. д.).
ПАРАДАК ДНЯ:
1) Пытаньні ўборкі і першапачатковай апрацоўкі ільну - канапель і задачы цэнтральнага і раённага друку (дакладчыкі: т. т. Паніматка і Стрэле)
2. Даклады газэт: цэнтральных—т. т. Лебедэў («Калгасьнік Беларусі»), Ітін («Чырвоная Зьмена»); раённых рэдактары горацкай і лепельскай газэт.
На нараду абавязковая ўдзел рэдактароў раённых газэт (ільнаканапляводчых раёнаў) і камуністаў—работнікаў усіх цэнтральных газэт.
КУЛЬТПРОП ЦК КП(б)Б.

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" Першая гукавая мастацкая карціна Пуцёўка ў жыцьцё Драма ў 34 эпізодах
„КУЛЬТУРА" Пач. у 7; 8-45; 10-30 Сёньня кіно закрыта Заўтра, 1-VIII—новая карціна—„ЖОНКА".
Інтэрнацыянал Пач. у 7 г. веч. БАБЫ РАЗАНСКІЯ Рэжысэр Вольга Праабражэнская. У гал. ролях: З. Цасарская, Р. Пужная.
„Пралетары" Адкр. з 12 г. дня. 2 сэрыі, 18 част. у адзін сэанс СТЭНЛЕЙ у нетрах Афрыкі.
„ЮНЫ ПІЯНЭР". Гэтымі днямі ў памяшканьні кіно „Культура" адбудзецца адкрыцьцё кіно „ЮНЫ ПІЯНЭР" сачэце за рэклямай.
„СПАРТАК" Пач. у 7, 9, і 11, Каса—з 5 гадз. Замежны фільм ЧАЛАВЕК, ЯКІ СЬМЯЕЦЦА ў 10 частках

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ВЫШЭЙШЫ ВЯЧЭРКІ ПЭДІНСТЫТУТ
абвяшчае прыём студэнтаў на наступныя факультэты і аддзяленьні:
1. Літаратурна-лінгвістычны ф-т.
а) Аддз. літаратурна-педагагічнае . . . 30 асоб.
II. Педалёга-педагагічны ф-т.
а) Аддз. педалёгічнае . . . . . 30 асоб.
Заявы прымаюцца ў канцылярыі Пэдінстытуту (Менск, Унівэрсытэцкі Гарадок, прыродазнаўчы корпус) да 10 верасьня 1931 г. штодзённа, акрамя 5, 10, 15, 20, 25, 30 чысла кожнага м-ца.
Пачатак заняткаў 1-га кастрычніка 1931 году. Правілы прыёму тыя-ж, што і на дзенны Пэдінстытут, якія абвешчаны ў даведнику НКА.
Стыпэндыямі і інтэрнатамі студэнты вячэрняга Пэдінстытуту не забясьпечваюцца.
Дырэктар Пэдінстытуту В. РУДНІЦКІ.

ЧАЧЭРСКІ сельска - гаспадарчы тэхнікум сьвінагадоўлі
абвяшчае АСЕНЬНІ НАБОР на 1-шы курс тэхнікуму.
Заявы падаюцца па адрасе: м. Чачэрск (Гомельшчына, Сьвінагадоўчаму тэхнікуму) да 10верасьня
Да заявы прыкладаюцца ўсе дакументы, згодна даведніка НКА за 1930-31 г.
З 10 па 15 верасьня праводзяцца іспыты асобам, якія ня могуць паступіць у тэхнікум бяз іспытаў.
Студэнты забясьпечваюцца інтэрнатам аднолькава з індустрыяльнымі тэхнікумамі
Заняткі пачынаюцца з 1 кастрычніка.
Залічэньнем будзе паведамлена пэрсанальна.
Дырэктар тэхнікуму Суконьнікаў.

УСЕ ў кіно „СПАРТАК"
з 28-га ліпеня па 1-га жніўня
штодзённа адзін дадатковы сэанс
„ХИЖИНА ДЯДИ ТОМА"
ў 6 частках.
увесь збор пойдзе ў карысьць авіябудаўніцтва краіны.
Пачатак з 5 г. 15 м. | КАСА—з 4-х г. дня.

ЖЛОБІНСКАЯ ЯЙКА-ПТУШНАЯ ФАБРЫКА
абвяшчае ПРЫЁМ ЗАЯЎ у ФЗВ,
які арганізуецца пры Жлобінскай фабрыцы і камбінаце на базе 5-6 груп.
Умовы прыёму, як і ў іншыя ФЗВ.
Прыём заяў праводзіцца з 1 верасьня да 1 кастрычніка 1931 году Жлобінскай яйка-птушнай фабрыкай.
Пачатак заняткаў з 1 кастрычніка.
Прынятыя ў ФЗВ будуць забясьпечаны стыпендыяй і інтэрнатам.
Дырэкцыя Жлобінскай яйка-птушнай фабрыкі.

БАБРУЙСКІ КАМБІНАТ
каапэрацыйнае асьветы
БЕЛКААПСАЮЗУ
абвяшчае набор слухачоў на рахункова-фінансавае аддзяленьне на базе 7-годзі.
Узрост—ад 16 год. Прымаюцца ў першую чаргу рабочыя, калгасьнікі, батракі, беднякі і іх дзеці. Перавага даецца асобам, камандыраваным райспажыўсаюзамі, камсамольскімі і прафсаюзнымі арганізацыямі.
Усе прынятыя слухачы забясьпечваюцца стыпэндыяй у разьмеры 30 руб. у месяц (з якіх 18 руб. ідзе на харчаваньне).
Тэрмін навучаньня 2 гады. Рахункова-фінансавае аддзяленьне рыхтуе бухгальтароў для райсаюзу, ЦРК, ЗРК.
Па сканчэньні навучаньня слухач накіроўваецца на працу толькі ў спажыўсыстэму.
Да заявы прыкладаюцца: 1) даведка аб сац. становішчы, 2) пасьведчаньне аб адукацыі, 3) аб узросьце, 4) аб стане здароўя, 5) засьведчаная анкета.
Заявы з дакументамі прымаюцца да 15 жніўня па адрасе: Бабруйск, Сацыялістычная вул., дом № 128, камбінат каапасьветы.

Менгарком КП(б)Б і Гарком ЛКСМБ
склікаюць на сёньня, 31 ліпеня, у 7 гадз. веч., у залі Горкому КП(б)Б
НАРАДУ ВАЕНОРГАЎ ЯЧЭК КП(б)Б і КЛСМБ.
Яўка ваеноргаў абавязкова.

БЕЛАРУСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ
ПЛЯНАВА-ЭКАНАМІЧНЫ ІНСТЫТУТ
(арганізаваны на базе прамысловага, сельска-гаспадарчага і плянавага аддзяленьня Наркасу БДУ і Экфака Беларускай сельска-гаспадарчай акадэміі)
АБВЯШЧ